

«ТРАПІЦЬ У ПАЛОН ДА... ФІЗІКІ»

ЧЫРВОНКА

«СУЗОР'Е» КЛЁВЫХ ПЕДАГОГАЎ



ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЛІПЕНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 141 (29255)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАНІК, міністр аховы здароўя:**

*«Сітуацыя з COVID-19 усюды кіраваная. Мы не паслабляем кантроль. Ва ўсіх рэгіёнах мы бачым не толькі стабільную сітуацыю, але і стабільнае зніжэнне колькасці хворых. У рэгіёнах, якія пазней уваходзілі ў эпідпрацэс, лічбы крыху вышэйшыя, чым у іншых. Але ўстойлівае зніжэнне колькасці пацыентаў як з пнеўманіяй, так і з каранавіруснай інфекцыяй мы назіраем паўсюдна ў краіне ўжо на працягу некалькіх тыдняў».*

# Пад крыламі анёла



Фота БелТА.

Да Дня пісьменства, які ў першыя выхадныя верасня пройдзе ў Бялынічах, у горадзе з'явіцца адметная скульптура «З'яўленне іконы». Анёл, выразаны з белага граніту, будзе трымаць бронзавую выяву адной з найвядомейшых беларускіх святынь — іконы Маці Божай Бялыніцкай. Трохметровы помнік размесціцца каля мясцовага храма ў гонар іконы.

Над стварэннем кампазіцыі працуе магілёўскі майстар Аляксандр МІНЬКОЎ. Пакрысе кавалак пакостаўскага граніту, прывезенага з Украіны, набывае абрысы анёла. Хутка скульптар пачне ўпрыгожваць яму крылы — на іх з'явіцца ўзор, падобны да нашай выцінанкі.

## КОРАТКА

- **У нашай краіне прыняты чатыры новыя будаўнічыя нормы.**
- Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 25 ліпеня прамыя тэлефонныя лініі.
- **«Белавія» з 30 ліпеня аднаўляе палёты ў Арменію.**
- Беларусь аднавіла імпарт электраэнергіі з Украіны.
- **Кантэйнерны цягнік з беларускімі піламатэрыяламі адправіцца ў Кітай 24 ліпеня.**



- У Беларусі зніжаецца смяротнасць ад захворвання на злаякасныя пухліны.
- **Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў дзейнічаюць у 24 раёнах Беларусі.**
- «Чырвоны мазыранін» пачаў пастаўляць прысмакі ў Казахстан.
- **Электронны кірмаш вакансій пройдзе 24 ліпеня ў Віцебску.**

ISSN 1990 - 763X

Камунальныя стасункі

# МЯСЦОВЫЯ ВІДЫ ПАЛІВА ЎСЁ ЧАСЦЕЙ ЗАМЯНЯЮЦЬ ГАЗ

## Службы ЖКГ рыхтуюцца да ацяпляльнага сезона

**Нягледзячы на тое, што ацяпляльны перыяд пачнецца як мінімум у канцы верасня, падрыхтоўку да яго камунальнікі пачынаюць ужо адразу пасля заканчэння папярэдняга. І традыцыйна пашпарты гатоўнасці прадпрыемствы жыллёва-камунальнай гаспадаркі павінны атрымаць да 30 верасня.**

Сёлета ў Беларусі плануюць замяніць амаль 640 кіламетраў цеплавых сетак. Больш за ўсё новага абсталявання з'явіцца на Міншчыне і Гомельшчыне — 125 і 114 кіламетраў адпаведна. На 1 ліпеня камунальнікі выканалі амаль 40 % ад плана і замянілі больш за 250 кіламетраў сетак. Акрамя гэтага, у краіне плануюць выканаць прафілактычны рамонт 3525 кацельняў і 1739 цэнтральных цеплавых пунктаў (ЦЦП). На 1 ліпеня гэта было ўжо зроблена больш чым у дзвюх тысячах кацельняў і амаль у палове ЦЦП.

— Што ж датычыцца будаўніцтва цеплавых крыніц на мясцовых відах паліва, то гэта прадугледжана дзяржпраграмай «Энергазберажэнне» на 2016—2020 гады, якую каардынуе Дэпартамент па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарта, — адзначае **начальнік аддзела энергетыкі і надзвычайных сітуацый Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Святлана ЦІМОШКІНА.** — Доля мясцовых відаў паліва летась складала 43,6 % у сістэме ЖКГ з улікам рэканструкцыі і запуску новых крыніц. У канцы мая лічба павялічылася ўжо да 45,2 %, а да канца года мы плануем выйсці на 52 %.

СТАР. 4

Асоба

Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ:

# «НАМ ТРЭБА, КАБ ТУТ ПРАЦАВАЛІ СВАЕ ЛЮДЗІ, ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ Ў РАЗВІЦЦІ ТЭАТРА»



**Вялікі падрыхтаваў прэм'еры і сышоў у адпачынак, а білеты на новыя оперы і балеты тым часам ужо ў продажы. Калі тэатр апусцеў, мы прыйшлі ў яго сцішэлыя сцэны, каб сустрэцца з мэтрам — мастацкім кіраўніком нашага Вялікага Валянцінам Елізар'евым, чалавекам, што нарадзіўся на азербайджанскай зямлі, вучыўся на расійскай, а працуе на беларускай. Вядомы харэограф вярнуўся ў тэатр, дзе ўжо ў 26 гадоў стаў галоўным балетмайстарам, амаль два гады таму пасля крыўднай працяглай паўзы, справакаваный канфліктам з Міністэрствам культуры. Валянцін Мікалаевіч кажа, што ад гэтага разрыву страціў і ён сам, і тэатр, і пасля вяртання заняўся, напрыклад, новымі аўтарскімі рэдакцыямі сваіх колішніх пастановак — зрэшты, пра гэта, а таксама пра каранавірус у Вялікім, музейную якасць балета і жанчын, якія плачуць на спектаклях, апавядаецца ў нашым інтэрв'ю.**

СТАР. 13

# «Калі ў краіне шмат цяжарных, значыць, яны ўпэўнены ў сваёй будучыні»



**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людміла МАКАРЫНА-КІБАК упэўнена: беларусы і беларускі могуць быць спакойныя за заўтрашні дзень.**

— З улікам эпідэмічнай абстаноўкі ў свеце ў цэлым вельмі добра, што мы былі загадзя гатовыя. Рана казаць пра вынікі ўвогуле, але наш падыход аказаўся дастаткова добры. Людзі атрымалі вельмі якасную дапамогу, лячэнне. Таму ў нас параўнальна невысокая смяротнасць і не вельмі высокая захваральнасць. Падыход, абраны Беларуссю, кіраўніком дзяржавы, выявіўся паспяховым.

У нас было закуплена абсталяванне, з 2007 года працавала вялікая праграма пераасношчэння стацыянарных, паліклінічных устаноў, мы захавалі інфекцыйныя аддзяленні, аказваецца высокатэхналагічная дапамога.

Ёсць абсталяванне — патрэбны навучаныя спецыялісты. У Беларусі на працягу многіх гадоў удзяляецца вялікая ўвага іх падрыхтоўцы. Сэнс у правільна абраным кірунку адукацыі пасля ВНУ, бо ў нас медыцынская адукацыя — праз усё жыццё.

Зноў жа, цяперашняя сітуацыя прадэманстравала, што інваліды, пацыенты інтэрнатаў абаронены. Яны практычна не хварэлі — а ў іншых краінах у такіх установах памірала больш за ўсё людзей. Мы разумеем, што работа органаў сацыяльнай абароны арганізавана правільна. Мы захавалі ўсіх людзей, нягледзячы на іх хранічныя захворванні, узрост, цяжкія паталогіі.

Вядома, вельмі шмат у нас зроблена для сям'і, каб былі шматдзетныя сем'і. Калі жанчына нараджае, значыць, яна ўпэўнена ў будучыні. Лічу, што гэта велізарнае дасягненне нашай краіны, што ў нас многа шматдзетных сем'яў. Таму што яны ведаюць: нягледзячы на колькасць дзяцей, яны будуць абароненыя, у іх ёсць жыллё, ёсць усе перспектывы для развіцця дзяцей. Разумею, што будучыня іх сям'і — у вельмі надзейных руках.

Праблема павышэння нараджальнасці існуе ва ўсім свеце, і сёння мы звяртаем увагу нашых татаў — не толькі матулі, але і бацькі павінны быць упэўненыя, што іх сем'і будуць эканамічна незалежныя (па гендарным прынцыпе дзяленне ўсё ж было). Сёння ўжо не заўсёды мама — з малымі, а тата — здабытчык: мы нават па парламенце бачым, колькі ў нас жанчын.

Пасяляем упэўненасць у нашых мужчын і кажам пра тое, што таты таксама маюць магчымасць пайсці ў дэкрэтны водпуск, а жанчыны — зарабляць грошы. У гэтым плане ў нас у краіне робіцца ўсё для таго, каб асоба развівалася гарманічна, каб было спакойна, каб быў мір. Усё гэта зроблена за гады незалежнасці.

**Запісала Варвара МАРОЗАВА.**

Выбары-2020

## Маршрут на ўчастак падкажа смартфон

**Сёння запускаецца мабільная праграма «Галасую!» Бясплатны сэрвіс, распрацаваны актывістамі БРСМ, дапаможа ўсім выбаршчыкам вызначыць адрас свайго ўчастка, назву будынка, у якім ён знаходзіцца, а таксама кантактны тэлефон. Акрамя таго, на асобнай старонцы можна будзе азнаёміцца з біяграфіямі ўсіх кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.**

У праграме рэалізавана функцыя «Пракласці маршрут», якая перанакіроўвае карыстальнікаў у Google або Yandex maps і знаходзіць найбольш зручны для іх маршрут пешшу, на таксі, грамадскім транспарце або асабістым аўтамабілі. Таксама ёсць блок «Навіны», у якіх можна знайсці актуальную інфармацыю з раздзела «Палітыка». Распрацоўшчыкі — студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзім Уладымцаў, Ягор Голубеў і Юрый Скробат — дадалі магчымасць і зваротнай сувязі. Сэрвіс даступны як для карыстальнікаў Android, так і для прыхільнікаў iOS. Дарэчы, ёсць і яго камп'ютарная версія ў выглядзе сайта.

Па завяршэнні выбарчай кампаніі праграма працягне сваю дзейнасць ужо ў новым фармаце пад назвай «Мой дэпутат». Зацікаўленыя змогуць знайсці неабходную інфармацыю пра кожнага дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі: іх біяграфіі, графікі прыёму, кантактныя тэлефоны ды іншае.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Меркаванні

# «Каб не згубіць тое, чаго мы дасягнулі...»

**Віктар ВАТЫЛЬ, загадчык кафедры паліталогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, доктар палітычных навук, прафесар:**



— Пры ўсім эмацыянальным напале (дый тое — не лічу, што ён такі ўжо вялікі) выбарчая кампанія ідзе ў рамках сучаснага выбарчага працэсу. Якая асаблівасць? Завяршыўся першы этап. І на гэтым першым этапе вызначыліся асобныя элементы, якія ўласцівыя наступнаму этапу — агітацыйнаму. Працэй кажучы, агітацыя праходзіла не ў свой час, што само па сабе незаконна.

Разам з тым гэты этап паказаў, што тут існаваў пэўны латэнтны план, калі ствараліся задумы, установкі, калі былі заказчыкі, рэжысёры, фарміраваліся прадстаўнікі, меркавалася, якая будзе аўдыторыя і хто будзе выканаўцам. І гэты латэнтны схаваны план стаў рэзка праяўляць сябе на гэтым першым этапе. Улады адрэагавалі на іх, і гэта невыпадкова, бо асобныя дэталі гэтых працэсаў паказалі, што тут ёсць нездаровае імкненне да распальвання ажыятажу ўнутры краіны і імкненне справакаваць знешнія дзяржавы да ўмяшання ў нашы ўнутраныя справы. І на жаль, нейкая невялікая частка маладзёжнай аўдыторыі, не разумеючы гэтага, паставіла пад пагрозу і незалежнасць, і суверэнітэт. Гэта галоўнае.

Бо выбары — не самамэта. Гэта чарговая форма заключэння грамадскага дагавора паміж уладай і грамадствам, і тут важна ўстанавіць патрэбнае для нас усіх правіла, якое будзе спрыяць у далейшым рашэнню нашых агульных задач — як у паўсядзённым жыцці, так і на перспектыву.

Я разумею, што стаіць за вулічнымі пратэстамі. Гэта пэўныя групавыя інтарэсы, намеры і задумы, якія нярэдка нават не ўсведамляюцца самімі выканаўцамі, таму што за кадрам застаюцца тыя, хто рэжысіраваў гэтыя рэчы. Але вопыт такіх правакацый, якія перыядычна ўзнікалі, сведчыць пра тое, што гэтыя рэчы імкнуліся прымяніць і ў нас. Я мяркую, усяму будзе дадзена свая прававая ацэнка.

Зразумела, зараз няпросты час. У свеце назіраецца перыяд нявызначанасці і нестабільнасці. На нас звалілася, можна сказаць, эпідэмія каранавіруса. Хто ўзяў на сябе асноўны клопат і цяжар? Вядома, дзяржава. А што гэта значыць? Тое, што гэта сістэма мясцовых, рэгіянальных і рэспубліканскіх органаў кіравання. Я заўважу, што пры ўсёй «шурпатасці» адміністраванне было на ўзроўні. І гэта не прыходзіць знянацку. Гэта доўгі вынік работы ўсіх узроўняў нашай сістэмы. Мы бачым, што ўлада ідзе насустрач выклікам, прапануючы шляхі рашэння. Асабіста я аналізую гэта як спецыяліст і хацеў бы, каб мы аддалі сваю перавагу таму, каб не згубіць тое, чаго мы дасягнулі, а я бачыў за 30 гадоў розныя стадыі. І зроблена на парадак больш, чым было дагэтуль. Гэта трэба захаваць.

**Запісала Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# «Захаванне прамысловасці з'яўляецца складнікам поспеху ў развіцці любой краіны»

**Віктар МАЦІЕВІЧ, генеральны дырэктар ААТ «Магатэкс», лаўрэат прэміі Магілёўскага аблвыканкама «Чалавек года»:**



Фота з сайта news.21.by

— Самым галоўным дасягненнем за час суверэнітэту краіны лічу тое, што атрымалася захаваць нашу прамысловасць, эканоміку. Пасля развалу Савецкага Саюза шмат у якіх краінах усё было накіравана на закрыццё вытворчасцяў і памяншэнне іх колькасці. На мой погляд, захаванне прамысловасці з'яўляецца складнікам поспеху ў развіцці любой краіны. Гэта і падаткі, і магчымасць утрымаць якасць і даступнасць сацыяльных паслуг — медыцынскага абслугоўвання, адукацыі — усяго таго, без чаго не можа абысціся ніводны з нас. Наша прадпрыемства, як і ўся краіна ў цэлым, прайшло складаны перыяд часу станаўлення, калі пачалі закрывацца і змяняцца рынкі збыту, калі знізіліся аб'ёмы вытворчасці. І ў гэты цяжкі ва ўсіх адносінах момант дзяржава зрабіла ўсё магчымае, каб захаваць і развіць прадпрыемства. У 2008—2012 гады пры падтрымцы дзяржавы «Магатэкс» змог зрабіць маштабную мадэрнізацыю вытворчасці. З прыблізна 40 мільёнаў долараў, укладзеных у пераабсталяванне, 20 мільёнаў былі крэдытнымі сродкамі, якія дала дзяржава. За наступныя пяць гадоў мы атрымалі станоўчае сальда — звыш 300 мільёнаў, якія ўнеслі ў казну дзяржавы.

Некаторыя краіны існуюць дзякуючы таму, што могуць прадаць карысныя выкапні, нафту, газ. Але калі адбываюцца нейкія катаклізмы ў свеце, разумееш, як важна мець сваю вытворчасць. Мы захавалі яе і працягваем развіваць. Гэтым мы вельмі адрозніваемся ад некаторых краін былога Савецкага Саюза. Стабільнасць у дзяржаве, стабільнасць у эканоміцы, стабільнасць у развіцці — гэта галоўныя дасягненні нашай краіны. І гэта гарантыя нашай будучыні. Калі мы выязджаем за межы Беларусі, размаўляем з патэнцыйнымі пакупнікамі, шмат хто з іх пытаецца, ці праўда, што ў нас на прадпрыемстве захавалася вытворчасць тых ці іншых тканін. І мы адказваем, што не толькі захавалася, але ўзнялася на вышэйшы ўзровень. Па сваёй прадукцыі мы сёння амаль цалкам адпавядаем сусветным стандартам. Яна карыстаецца попытам ва ўсім свеце. На жаль, ёсць абмежаванні па сертыфікацыі, дакументацыі, але запатрабаванасць ёсць.

Для нашых партнёраў таксама вельмі важная палітычная стабільнасць у краіне. Калі яе няма, няма і гарантыі, што вытворчасць будзе забяспечана сыравінай, электраэнергіяй і гэтак далей. Менавіта палітычная стабільнасць вабіць шматлікіх партнёраў працаваць з беларускімі кампаніямі, у тым ліку і «Магатэксам». Усё гэта робіць беларускую эканоміку больш моцнай і надзейнай. У людзей ёсць упэўненасць у заўтрашнім дні, у тым, што ў іх будуць работа, сацыяльныя выплаты, што краіна забяспечыць нармальнае развіццё ім, а таксама іх дзецям, унукам і будучым нашчадкам.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Урад Іспаніі выключыў правядзенне рэферэндуму па пытанні манархіі



Пра гэта заявіла віцэ-прэм'ер каралеўства Кармэн Кальва ў Кангрэсе дэпутатаў (ніжняя палата парламента), паведаміў ТАСС. Прадстаўнік баскскай нацыяналістычнай партыі «Більду» Джон Іньярыту спытаў намесніка кіраўніка кабінета міністраў наконт магчымасці правядзення плебісцыту па пытанні манархічнай формы праўлення. «Ніякі рэферэндум не плануецца, — запэўніла Кальва. — Кіраўніцтва дзяржавы не стаіць пад сумневам у гэтай краіне». Як вядома, Іспанія — парламенцкая манархія, кіраўніком дзяржавы з'яўляецца кароль. Апошнім часам у мясцовых СМІ усплывае ўсё больш інфармацыі, звязанай з расследаваннямі ў Іспаніі і Швейцарыі ў дачыненні да Хуана Карласа І — былога кіраўніка дзяржавы і бацькі караля Філіпа VI.

### Ілон Маск увайшоў у топ-5 найбагацейшых людзей свету



Заснавальнік кампаніі SpaceX і генеральны дырэктар Tesla ўвайшоў у топ-5 самых багатых людзей свету па версіі часопіса Forbes. На гэтым тыдні капітал Маска склаў 74,2 мільярда долараў. Усяго за суткі бізнесмен стаў багацейшым больш чым на 5 мільярдаў долараў у выніку росту кошту акцый Tesla, паведаміла РБК. Узначальвае гэты рэйтынг кіраўнік Amazon Джэф Безас. Яго капітал вырас да 189 мільярдаў долараў. Далей размясціліся прэзідэнт групы кампаній Louis Vuitton Moet Hennessy Бернар Арно (113,8 мільярда), адзін са стваральнікаў Microsoft Біл Гейтс (113,4 мільярда) і стваральнік Facebook Марк Цукерберг (90,3 мільярда). У студзені Tesla абышла па капіталізацыі другога аўтавытворцу планеты — Volkswagen AG. Цяпер кампанія пераўзыходзіць нямецкі аўтаканцэрн па гэтым паказчыку ўжо больш чым удвая. У ліпені яна абагнала па рынкавым кошце і лідара — Toyota.

Прыёмная кампанія — 2020

# Згубіў сертыфікат? Звяртайся па дублікат!

## 24 ліпеня ў пунктах правядзення ЦТ распачнецца выдача сертыфікатаў

**Для іх атрымання абітурыент павінен звярнуцца ў тую навучальную ўстанову, на базе якой здаваў дысцыпліны ЦТ. Згодна з Палажэннем аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, абітурыент атрымлівае сертыфікат асабіста пры прад'яўленні арыгінала пашпарта і пропуска з адзнакай «Тэсціраванне прайшоў». Сертыфікат выдаецца абітурыенту пад роспіс, а пропуск у яго забіраюць. У выпадку страты пропуска абітурыент падае заяву аб выдачы сертыфіката без прад'яўлення пропуска.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Калі абітурыент па ўважлівай прычыне не можа атрымаць сертыфікат ці яго дублікат асабіста, гэта можа зрабіць законны прадстаўнік непаўналетняга абітурыента (хтосьці з яго бацькоў або апекуноў) пры прад'яўленні: арыгінала пашпарта законнага прадстаўніка; дакумента, які пацвярджае статус законнага прадстаўніка (пасведчанне аб нараджэнні); копіі пашпарта абітурыента, заверанай натарыяльна.

Таксама сертыфікаты можа забраць прадстаўнік абітурыента пры прад'яўленні: арыгінала свайго пашпарта; даверанасці, заверанай натарыяльна або ўпаўнаважанай асобай; копіі пашпарта абітурыента, заверанай натарыяльна.

Паколькі сертыфікат — вельмі важны афіцыйны дакумент, правярадь дакладнасць яго афармлення, у прыватнасці, напісанне прозвішча, імя і імя па бацьку, трэба неадкладна, інакш праблемы абавязкова ўзнікнуць ужо пры падачы дакументаў у прыёмную камісію. Сертыфікат з несапраўднымі звесткамі падлягае замене.

> У тым выпадку, калі абітурыент сапсаваў або страціў сертыфікат (а такія выпадкі здараюцца кожны год), апошні могуць замяніць. Для гэтага трэба звяртацца ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў.

Для атрымання дубліката сертыфіката падаюцца наступныя дакументы: пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу; заява з указаннем прычыны атрымання дубліката сертыфіката; сапсаваны сертыфікат ці даведка з установы адукацыі ў выпадку, калі паміж навучэнцам і ўстановай вышэйшай ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі былі датэрмінова спынены адукацыйныя адносіны, аб'ява аб згубленым сертыфікаце ў газеце. Дублікат выдаецца на працягу пяці дзён з моманту падачы адпаведнай заявы.

У выпадку замены дакумента, які сведчыць асобу, у перыяд паміж датай рэгістрацыі ў якасці абітурыента і датай выдачы сертыфіката апошні павінен афармляцца ў адпаведнасці з данымі новага дакумента, які сведчыць асобу.

Тыя, хто праходзіў тэсціраванне ў рэзервовыя дні, змогуць атрымаць сертыфікаты з 29 ліпеня.

Не выдадзеныя абітурыентам сертыфікаты захоўваюцца ў пунктах правядзення ЦТ да канца каляндарнага года, які ідзе за годам здачы ЦТ.

# «ЭЛЕКТРОННАЯ ШПАРГАЛКА» ДЛЯ АХВОТНЫХ ТРАПІЦЬ У IT

## Ці ведаеце вы, чым адрозніваецца эксперт па даных ад аналітыка даных? А чым займаецца SEO-спецыяліст або тэхнічны пісьменнік?

**IT-галіна імкліва развіваецца. Кожны год у ёй з'яўляюцца новыя тэхналогіі, кірункі і спецыялізацыі, і ў тых, хто хоча ў яе трапіць, разбягаюцца вочы ад разнастайнасці магчымасцяў. Напярэдадні чарговай уступнай кампаніі аддзел адукацыйнай дзейнасці Адміністрацыі ПВТ падрыхтаваў электронны даведнік, які дапаможа моладзі сарыентавацца са сваёй адукацыйнай траекторыяй.**

Нягледзячы на разнастайнасць IT-спецыяльнасцяў, прафесія праграміста ў IT-галіне з'яўляецца базавай. У наш час немагчыма стаць добрым праграмістам без сур'ёзнай матэматычнай падрыхтоўкі. Праграмаванне — гэта мноства рознага кшталту задач, якія на 70 % складаюцца з матэматыкі і логікі. Акрамя таго, у большасці выпадкаў праграміст павінен валодаць некалькімі мовамі праграмавання. Таксама неабходна ведаць англійскую мову. У стагоддзе тэхнічнай рэвалюцыі тэхналогіі развіваюцца вельмі імкліва, з'яўляюцца новыя сэрвісы, платформы, мовы праграмавання, а гэта значыць, што трэба заўсёды быць гатовым вывучаць новае, быць гнуткім і хутка адаптавацца.

Вынікі апытання рэзідэнтаў ПВТ сведчаць, што ў 2019 годзе IT-кампаніі прынялі на работу найбольшую колькасць тых выпускнікоў універсітэтаў, якія праграмуюць на JavaScript, Java, C# /.NET, PHP, Python, Swift, C++, Ruby/Rails, Objective-C і Kotlin. Таксама, нягледзячы на тое што рынак працы ў гэтым сегменце ўжо дастаткова насычаны, на работу прынята шмат маладых спецыялістаў па забеспячэнні якасці і спецыялістаў па тэсціраванні праграмнага забеспячэння. Запатрабаваныя таксама і пачынаючыя бізнес-аналітыкі.

Імклівы рост IT-галіны азначае і тое, што ў ёй цяпер ёсць месца не толькі для тэхнічных спецыялістаў. Парк высокіх тэхналогій добра адчуў гэта, калі яго рэзідэнты, акрамя выканання распрацовак на заказ, сталі ствараць уласныя прадукты, у тым ліку вядомыя ва ўсім свеце. Адпаведна, хутка вырас попыт на прадуктовых маркетолагаў, дызайнераў, эканамістаў і іншых гуманітарыяў. Да таго ж практыка паказала, што з людзей з гуманітарнай адукацыяй атрымліваюцца нядрэнныя тэхнічныя пісьменнікі, бізнес-аналітыкі, спецыялісты па найме і рабоце з персаналам. Так што неабходнасць быць «сухім тэхнаром», каб паспяхова працаваць у IT-галіне, — гэта міф. Таксама міфам з'яўляецца і думка, што IT-галіна — не для жанчын. Насамрэч ва ўсіх IT-прафесіях працуюць як мужчыны, так і жанчыны. А ў некаторых спецыялізацый, такіх як бізнес-аналітык і тэсціроўшчык, у ПВТ хутчэй нават жаночае аблічча.

Універсітэт — толькі стартавы адрэзак прафесійнага шляху будучага IT-спецыяліста. Асноўная яго частка пройдзе ў IT-кампаніях, таму ў гэтай галіне ўжо стала нормай сітуацыя, калі навучанне ў ВНУ цесна пераплецена з практычнай работай у кампаніях. Штогод стажыроўку ў ПВТ праходзяць больш за тысячу студэнтаў. Значная іх колькасць часткова працаўладкоўваецца і на пастаяннай аснове бярэ ўдзел у распрацоўцы рэальных праектаў IT-кампаній.

З'яўляючыся асноўнымі работадаўцамі, IT-кампаніі падказваюць універсітэтам, чаму і як лепш вучыць студэнтаў. Толькі кампаніямі — рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій як заказчыкамі IT-кадраў створаны і падтрымліваюцца 60 сумесных навукова-вытворчых лабараторый і вучэбных цэнтраў на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі. Многімі кампаніямі распрацаваны і выкладаюцца спецыялізаваныя адукацыйныя курсы, інтэгравання ў навучальны працэс профільных кафедраў. Таксама працуюць 34 філіялы кафедраў універсітэтаў непасрэдна на тэрыторыі Парка высокіх тэхналогій і на вытворчых пляцоўках кампаній — рэзідэнтаў ПВТ у Мінску і ў абласных гарадах.

> **Неабходнасць быць «сухім тэхнаром», каб паспяхова працаваць у IT-галіне, — гэта міф. Таксама міфам з'яўляецца і думка, што IT-галіна — не для жанчын.**

Так што часам выбар факультэта для вучобы варта пачынаць з выбару IT-кампаніі, дзе малады чалавек хацеў бы ў будучым працаваць. Мае сэнс даведацца, з якім факультэтам супрацоўнічае гэтая кампанія, і паступаць менавіта туды.

Які абраць універсітэт і факультэт? У чым спецыфіка кожнага з іх? Як трапіць у IT-кампанію на стажыроўку? Што чакае выпускніка пасля размеркавання? Ці магчыма атрымаць IT-спецыяльнасць у рэгіёнах? Адказы на гэтыя ды многія іншыя пытанні можна будзе знайсці ў падрыхтаваным электронным даведніку, які размешчаны для свабоднага спампоўвання на сайце ПВТ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Транспарт

# НА «ДЗЯСЯТКУ»!

**Вось і ўсё: чарговы заказ выкананы. Апошні, дзясяты пяцівагонны цягнік для Мінскага метрапалітэна пакінуў тэрыторыю прадпрыемства «Штадлер Мінск». Гэта было ў канцы мая, а цяпер, пасля паспяховага завяршэння прыёма-здатачных працэдур, пачата яго камерцыйная эксплуатацыя на дзейных лініях мінскага метро разам з астатнімі, раней пастаўленымі саставамі.**

Як вядома, у пачатку лютага гэтага года адбылася першая паездка з пасажырамі на новым чатырохвагонным цягніку метро Stadler, а ўжо сёння ўсе дзесяць саставаў знаходзяцца ў пастаяннай эксплуатацыі. Па аналогіі з першым чатырохвагонным, цягнік у пяцівагонным выкананні прахадзіў неабходны аб'ём прыёмачных выпрабаванняў, вынікам якіх стала падпісанне акта адпаведнасці канструкцыі новага рухомага саставу для сталічнага метро патрабаванням бяспекі. Варта адзначыць, што ўсе цягнікі прайшлі прыёмачныя выпрабаванні паспяхова і своечасова.

Пасажыры і машыністы не раз адзначалі вартасці новых «Штадлераў»: яркі запамінальны дызайн, скразны праход уздоўж усяго састава, наяўнасць USB-раздымаў у пасажырскім салоне і сучасную інфармацыйную пасажырскую сістэму. А сістэма кандыцыянавання ў салоне і кабіне машыніста, вертыкальныя поручні ў зоне назапашвальнай пляцоўкі, нізкі ўзровень шуму і эрганамічнасць кабіны машыніста сталі своеасаблівай разыначкай новага метро. Сёння гэтыя цягнікі адпавядаюць усім неабходным патрабаванням у частцы бяспекі, камфорту, зручнасці кіравання і тэхнічнага абслугоўвання. Усё гэта дазволіла



Фота БелТА.

электрацягніку для Мінскага метрапалітэна мадэлі М110 стаць пераможцам конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» 2019 года ў намінацыі «Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння» з прысуджэннем статусу «Навінка года».

Маёмасць

# «Гарызонт», «Камволь» і «Крыён»...

## Акцыі якіх прадпрыемстваў сталіцы прапануюцца насельніцтву ў абмен на чэкі

**Пара, пара даставаць гэтыя пакуль не зусім каштоўныя паперы ды несці іх на абмен у Беларусбанк. Справа ў тым, што днямі «ў мэтах стварэння ўмоў для максімальнага выкарыстання жыхарамі горада Мінска імянных прыватызацыйных чэкаў (ІПЧ) «Маёмасць» пашыраецца спіс прадпрыемстваў, акцыі якіх прапануюцца да абмену», паведамляе Дзяржаўны камітэт маёмасці Беларусі.**

Пашырэнне спісу ажыццяўляецца ў два этапы. Спачатку з 15 ліпеня ў пералік дадаліся дзевяць таварыстваў з рэспубліканскай доляй, а 12 жніўня да іх далучацца сем таварыстваў з доляй горада Мінска.

Сярод новых акцыянерных таварыстваў, акцыі якіх з 12 жніўня паступяць у абмен на чэкі, ёсць дастаткова цікавыя для мясцовых інвестараў. Упэўнена гучаць адны толькі назвы такіх прадпрыемстваў, як «Гастраном «Ахоцкі», «ГУМ», «Мінскі домабудаўнічы камбінат» і «Будтрэст № 1».

Цяпер прапануюцца і акцыі з рэспубліканскай доляй уласнасці, сярод якіх добра вядомыя арганізацыі. Гэта адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Мінскі вагонарамонтны завод», «Аўтасіла», «Крыён», «Доследны завод металаканструкцый», «Беларускае марское параходства», «Камволь», «Прамдрук», «Кіруючая кампанія холдынгу «Гарызонт», «Авіякампанія Трансавіяэкспарт», «Мінскі вагонарамонтны завод» і іншыя.

Абмяняць чэкі «Маёмасць» можна ў падраздзяленнях Беларусбанка, якія здзяйсняюць гэтую аперацыю. Абмену падлягаюць чэкі, наліčаныя асабіста грамадзяніну або падораныя блізкімі сваякамі, але не больш за 250 штук. Азнаёміцца з поўным пералікам адкрытых акцыянерных таварыстваў, якія абменьваюць свае акцыі на ІПЧ «Маёмасць», а таксама здзейсніць аперацыі па абмене можна ў падраздзяленні гэтага банка па месцы жыхарства.

**Сяргей КУРКАЧ.**

З пошты «Звязды»

# НАВОШТА ЛІХТАР?

## Як вырашаюцца праблемы вулічнага асвятлення ў сельскай мясцовасці

**Аграгарадок Гасцілавічы знаходзіцца непадалёк ад Лагойска. Тут жыве больш за 500 чалавек. У населеным пункце ёсць сярэдняя школа, Дом культуры з кіназалай, бібліятэка, аддзяленне сувязі, крама, лазня, вясковы стадыён. Гэта цэнтр сельскагаспадарчага прадпрыемства «Лагойскі». Як кажуць, для жыцця і задавальнення бытавых, сацыяльных, культурных запатрабаванняў тут створаны нядрэнныя ўмовы. Аднак мясцовых жыхароў хвалюе адсутнасць асвятлення на вуліцах.**

«Вось ужо некалькі гадоў запар у вёсках і аграгарадках Лагойскага раёна рашэннем райвыканкама практыкуецца адключэнне вулічнага асвятлення ў летні перыяд, інакш кажучы, з 1 чэрвеня да 31 жніўня ў начныя гадзіны. Прычына — эканомія сродкаў на гэты артыкул расходаў, — піша нам жыхар вёскі Гасцілавічы Аляксей Андрэеў. — У свой час Генеральная пракуратура выявіла такія ж парушэнні ў гэтай сферы. Інфармацыя была надрукавана на сайце і ў сродках масавай інфармацыі.

Сапраўды, «Звязда» ў свой час пісала, што ў сувязі са скаргамі жыхароў Мінскай вобласці супрацоўнікі пракуратуры правялі праверку абгрунтаванасці такіх адключэнняў. Было выяўлена, што на тэрыторыі шэрагу рэгіёнаў Міншчыны на працягу некалькіх гадоў існуе практыка спыняць падачу асвятлення на вуліцах у летні перыяд ноччу. Адзначалася, што райвыканкамы не толькі ведалі пра гэта, але і самі прымалі рашэнні аб адключэнні, матывуючы свае крокі эканоміяй сродкаў. Як паведамляла пракуратура, у выніку адключэння асвятлення эканомія нязначная, — у Мінскім раёне, напрыклад, удалося сэканоміць толькі 6,2 % ад фактычных затрат.

Разам з тым такая сітуацыя негатыўным чынам паўплывала на крыміногенную абстаноўку, колькасць правапарушэнняў. Нязначная эканомія сродкаў непараўнальная з затратамі на раскрыццё правапарушэнняў і злачынстваў, лячэнне і рэабілітацыю пацярпелых, кампенсацыю страт у сувязі з атрыманымі грамадзянамі траўмамі.

Генеральная пракуратура ўнесла прадстаўленне ў Мінаблвыканкам, дзе патрабавала забяспечыць няўхільнае выкананне нормаў заканадаўства аб дзяржаўных сацыяльных стандартах.

> **«Калі фінансавання на асвятленне вуліц не хапае, неабходна распрацаваць і зацвердзіць праграму па эканоміі, недахоп сродкаў перакрываць за кошт дзеючых мерапрыемстваў па эканоміі энергазатрат, а не элементарнага адключэння».**

Дадам, што пытанні вулічнага асвятлення не носяць сістэмны характар. Але тым не менш яны ёсць. Накont эканоміі спецыялісты падказваюць выхад: калі фінансавання на асвятленне вуліц не хапае, неабходна распрацаваць



www.ksosvet.ru

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

і зацвердзіць праграму па эканоміі, недахоп сродкаў перакрываць за кошт дзеючых мерапрыемстваў па эканоміі энергазатрат, а не элементарнага адключэння. Гэта прамы абавязак сельвыканкамаў — арганізаваць асвятленне вуліц, што дакладна прапісана ў артыкуле 43 Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь». Тым не менш, як сцвярджае Аляксей Андрэеў, у пачатку гэтага года ён вусна звяртаўся ў Лагойскі сельскі Савет, дзе пацвердзілі, што ліхтары адключылі з мэтай эканоміі. «А вось за паўкіламетра ад нашага населенага пункта, на ўскраіне Лагойска, у раёне катэджнай забудовы насупраць раённай ветстанцыі ліхтары гараць заўсёды», — кажа Аляксей Андрэеў.

У Беларусі дзейнічаюць пэўныя мінімальныя дзяржаўныя стандарты, да якіх адносіцца і ўдзельная вага асветленых вуліц — не менш за 80 % ад агульнай колькасці іх у населеным пункце.

Калі сяло або вёска невялікіх памераў, то на адной вуліцы павінны гарэць не менш за два ліхтары, а таксама святлакропка каля аб'ектаў сацыяльнага і культурна-бытавога прызначэння. Для зусім маленькіх вёсак прадугледжаны два ліхтары — на ўездзе і выездзе. Больш за тое, пастановай Савета Міністраў ад 30 мая 2003 года № 724 аблвыканкамам даручалася праводзіць аналіз работы па абслугоўванні насельніцтва ў гарадах і раёнах у адпаведнасці з нарматывамі дзяржаўных сацыяльных стандартаў не радзей, чым раз на паўгоддзе. У пасёлках і сельсаветах — таксама. Верагодна, дзесьці адсутнічае магчымасць фінансавання, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы і іншых змяненняў. Заканадаўчая база ў нас дастаткова развітая і прадугледжвае ўсе магчымыя шляхі выхаду з сітуацыі, у тым ліку і па недастатковым фінансаванні на вулічнае асвятленне.

Разам з тым такія звароты — вынік таго, што выканкамы базавага ўзроўню і сельвыканкамы прымаюць рашэнні, якія не адпавядаюць заканадаўству.

Пасля таго як карэспандэнт «Звязды» пабывала ў раёне, пагутарыла з людзьмі, літаральна праз некалькі дзён уключылі вулічнае асвятленне. Як паведаміла **старшыня Лагойскага раённага Савета дэпутатаў Людміла МУРАВІЦКАЯ**, ліхтары зазялі ва ўсіх 316 населеных пунктах. А не было вулічнага святла па прычыне правядзення рамонтных работ. Факт пацвердзілі ў Лагойскіх раённых электрасетках, на балансе якіх знаходзіцца гэтая сфера.

Па словах **намесніка старшыні райвыканкама па пытаннях будаўніцтва і ЖКГ Яўгена ШАБУНІ**, асвятленне было адключана па рашэнні райвыканкама для правядзення балансаўтрымальнікам прафілактыкі і рамонту электраабсталявання. «На вулічнае асвятленне сродкі выдзяляюцца з бюджэту. Яшчэ не падлічвалі, наколькі іх хопіць. Але пакуль грошай дастаткова. А ліхтары зазялі сапраўды ў кожнай вёсцы і аграгарадку. Скаргаў ад жыхароў на гэтым тыдні не паступала. Калі дзесьці здарыцца нейкая тэхнічная непаладка, то яе аператыўна выправіць рамонтная брыгада РЭС», — сказаў напрыканцы Яўген Шабуня.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# МЯСЦОВЫЯ ВІДЫ ПАЛІВА ЎСЁ ЧАСЦЕЙ ЗАМЯНЯЮЦЬ ГАЗ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Як адзначылі ў Дэпартаменце па энергаэфектыўнасці, на сёння ў краіне ідзе работа па будаўніцтве 17 крыніц на драўнянным паліве і торфе. Іх агульная магутнасць складзе 112 МВт. Пры гэтым тры крыніцы агульнай магутнасцю 41,5 МВт будуць пабудаваны за кошт крэдытных сродкаў міжнародных фінансавых арганізацый, а астатнія 14 (на 70,8 МВт) — за кошт уласных сродкаў прадпрыемстваў, мясцовага і рэспубліканскага бюджэтаў.

— Цяпер ужо па дзесяці крыніцах былі атрыманы заключэнні дзяржаўнай экспертызы па праектнай дакументацыі і пачаліся будаўніча-мантажныя работы, а вось па астатніх сямі хутка завершыцца распрацоўка праектнай дакументацыі, — адзначае **кансультант аддзела прававой работы, кадравай палітыкі і камунікацый Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Ала ГАРКУНОВА.** — Найбуйнейшыя крыніцы сёлета з'явяцца на Міншчыне, дзе цяпер ужо ідзе ўстаноўка катлоў. Гэта датычыцца кацельні ў Слуцку магутнасцю 14 МВт, а таксама крыніц у Стоўбцах і Бараўлянах магутнасцю 12 і 21 МВт адпаведна.

У сваю чаргу, як адзначылі ў Міністэрстве ЖКГ, да 1 кастрычніка камунальнікі павінны папоўніць запасы драўнянага паліва да 1660 тысяч шчыльных кубаметраў, цяпер жа план выкананы крыху больш чым на 70 %. Дроў прадпрыемствы назапасілі ўжо каля 80 % ад запланаванага, на 56 % выканалі план па шчапе і на траціну па торфе. Што ж датычыцца драўняных адходаў, то яшчэ на пачатак ліпеня арганізацыі ЖКГ перавыканалі план амаль у шэсць разоў.

Да работы ў асенне-зімовы перыяд рыхтуюць і аб'екты водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі. Напрыклад, камунальнікі ўжо больш чым напалову выканалі план па прафілактычным абслугоўванні водаправоднай сеткі і вадаводаў. Акрамя таго, яны займаюцца прамыўкай і перакладкай сетак і вадаводаў, ажыццяўляюць прафілактычны агляд артэзіянскіх свідравін і водаразборных калонак, іх рамонт, рамантуюць і мяняюць гідранты і помпы, робяць тэхнічны агляд і перакладанне сетак і калектараў.

> **Згодна з новымі правіламі, з 2021 года адключаць гарачую ваду для спажыўцоў будуць не больш чым на 12 дзён.**

Рыхтуюць да ацяпляльнага сезона і жылыя дамы — на 1 ліпеня ўжо напалову выкананы план па прафілактычным рамонце сістэм ацяплення дамоў і цеплавых пунктаў, ажыццёўлена іх апрасоўка. Шмат увагі камунальнікі ўдзяляюць шкленню месцаў агульнага карыстання шматкватэрных жылых дамоў, рамонту балконаў і лоджый — на 1 ліпеня яны выканалі больш за палову плана. Такія ж лічбы дасягнуты і ў рамонце стыкаў сценавых панэляў і дахаў.

— Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ажыццяўляе штотыднёвы і штомесячны кантроль за падрыхтоўкай прадпрыемстваў сістэмы да ацяпляльнага сезона па розных паказчыках, — тлумачыць **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ Андрэй РАМАШКА.** — Наогул падрыхтоўка ідзе на ўзроўні мінулых гадоў, і ў поўнай гатоўнасці прадпрыемствы сферы ЖКГ будуць ва ўстаноўленыя тэрміны.

Што ж датычыцца сталіцы, то раённыя КУП ЖКГ да кастрычніка павінны атрымаць 40 пашпартоў гатоўнасці.

— У рамках традыцыйнага вясновага агляду жылога фонду камунальныя службы Мінска ўдакладнілі аб'ёмы работ, сфарміравалі графікі і планы мерапрыемстваў па падрыхтоўцы жылога фонду да будучага ацяпляльнага сезону, — адзначае **начальнік вытворчага аддзела ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Валянціна ГРЫДЗЮШКА.** — На сёння мы ўжо адрамантавалі ўнутраныя сістэмы ацяплення амаль у пяці тысячах дамоў, што складае 76 % ад плана. Выканалі апрасоўку 4348 дамоў і 5307 цеплавых вузлоў, што складае больш за 60 % ад плана.

Па інфармацыі Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі, на сёння ўжо была зроблена гідрапнеўмапрамыўка 1081 сістэмы ацяплення, што складае 65 % ад плана. Амаль на 90 % выкананы план па рамонце воданагравальнікаў, цыркуляцыйных і павышальных помпаў. Што ж датычыцца рамонту дахаў, то на сёння камунальнікі абнавілі амаль 185 000 квадратных метраў, што складае 65 % ад гадавога плана. Нейкая частка работ праводзіцца за кошт сродкаў бягучага рамонту, нейкая — за кошт капітальнага. Ужо больш чым на 70 % ад плана выкананы рамонт стыкаў сценавых панэляў, ушчыльненне загараджальных канструкцый і шкленне месцаў агульнага карыстання. Амаль на 90 % выкананы план па рамонце балконаў — на сёння адрамантавана 1350 канструкцый.

— Цяпер камунальныя службы прачысцілі 9649 дымавых і 18 720 вентыляцыйных каналаў, і яны знаходзяцца ў тэхнічна спраўным стане, — дзеліцца Валянціна Аляксандраўна. — На 1 ліпеня было паверана амаль 2500 прыбораў уліку, што складае амаль 70 % ад плана, таксама было ўстаноўлена шэсць з дзевяці сістэм аўтаматычнага рэгулявання цяпла.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

### У тэму

На прэс-канферэнцыі **першы намеснік генеральнага дырэктара, галоўны інжынер ДВА «Белэнерга» Уладзімір БАБРОЎ** адзначыў, што аб'екты ведамства таксама вядуць падрыхтоўку да ацяпляльнага сезона. На сёння ўжо выканана замена 117,32 кіламетра цеплавых сетак у 1-трубным вылічэнні, што складае 64,1 % ад гадавога плана, падрыхтавана больш за 340 тысяч тон топачнага мазуту пры патрэбе ў 350 тысяч.

— Што ж датычыцца электратэхнічнага абсталявання, то ўсе работы выконваюцца ў поўным аб'ёме, — адзначыў спецыяліст. — Рамонт падстанцый і работы па павышэнні надзейнасці электрасетак выкананы больш чым на 60 % па ўсіх пазіцыях.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 ЛІПЕНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15890)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Ян ЯРАШ:

# «Я ЎСЁ САМ САБЕ ЎЖО ДАКАЗАЎ...»



**Ён з тых маладых артыстаў, у асобе якіх гарманічна спалучаюцца талент, працавітасць і жаданне жыць па сваіх унутранных адчуваннях. Ён стапрацэнтна выкладваецца на сцэне, прычым не важна, вакальнае гэта шоу, сольны канцэрт альбо выступленне ў бары. Любіць эксперыментаваць і ведае, што ў кожнага свой час для поспеху, пошукаў і перамен. Падчас сустрэчы спявак падзяліўся думкамі пра музыку, падводныя камяні самапрасоўвання і прыярытэты...**

***— На вашым сайце можна сустрэць такія радкі: «Ян Яраш — гэта інтэлігентная музыка з арыентацыяй на сусветныя павевы». Што сёння для вас важна ў музыцы і наколькі гэта адрозніваецца ад тых часоў, калі вы толькі пачыналі як сольны артыст?***

— У маёй творчасці асноўны пасыл — гэта музычнасць, прычым не важна, наколькі складана тое зрабіць. Таму што ў мяне было ўжо шмат праектаў, дзе я перакануўся, як можна мудрагеліста закруціць нейкую ідэю і яе ніхто не зразумее. Хочацца як мага прасцей гаварыць пра складаныя рэчы. Гэта датычыцца перш за ўсё запісу музычнага матэрыялу. А вось падчас канцэртаў ужо можна дазволіць сабе эксперыментаваць. Напрыклад, аднойчы нядаўна мы рабілі канцэрт з Міхаілам Радунскім у суправаджэнні камернага аркестра, і для мяне гэта быў вельмі карысны вопыт, але я не раіў бы ісці на такія канцэрты тым, хто толькі пачаў знаёміцца з маёй творчасцю. І разам з тым рады, што прыйшлі тыя людзі, якія хацелі пачуць маю музыку менавіта ў такім ключы.

***— Як паказаў чарговы адбор на «Еўрабачанне», ваша музыка адрозніваецца ад таго, што мы чуем сёння на эстрадзе... Можа, ведаеце, як выйсці на масавага слухача?***

— Адбор на «Еўрабачанне» мне асабіста паказаў, што трэба было больш працаваць над рэкламай. Такіх высокіх адзнак журы я не чакаў. А потым ужо зразумеў: прадстаўляць Беларусь будзе VAL. Я бачу прычыну ў тым, што не меў настолькі шырокай піяр-кампаніі і каманды, якая б займалася маім прасоўваннем. Тая ж падтрымка, якую ім аказаў фестываль «Рок за Баброў» падчас прамога эфіру, у нас адсутнічала. Але калі б я мог прадбачыць, што журы ацэніць мяне так высока, то, вядома, мы дапрацавалі б і гэты кірунак. Не хапіла ўсяго каля 300 паведамленняў. Гэты вынік вельмі паказальны для мяне як для чалавека, які ўсяго дабіваецца сам.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Жыві і квітней, Беларусь! Маладосць на маршы

# ТРАПІЦЬ У ПАЛОН ДА... ФІЗІКІ

### Выпускнік гімназіі і без пяці хвілін студэнт тлумачыць, чаму гэтай навукай немагчыма не захапіцца

**Фізіка традыцыйна лічыцца адной з самых складаных школьных дысцыплін. Нават у чалавека, які ўжо даўно скончыў школу, успаміны пра яе нярэдка выклікаюць думкі кшталту «Дзякуй Богу, што ўсё гэта скончылася». Але зусім іншай думкі прытрымліваецца выпускнік жодзінскай гімназіі № 1 Яраслаў ЯКУБОЎСКІ.**

— З усіх прадметаў у школе на першым месцы для мяне стаіць фізіка. Матэматыка, хімія і іншыя дысцыпліны — толькі інструменты, а фізіка знаходзіцца над імі ўсімі, яна аб'ядноўвае веды з многіх навук для нейкай важнай мэты. Гэта вельмі жыццёвы прадмет, які тлумачыць, што і чаму вакол нас адбываецца, — разважае хлопец. — Ну як можна не захапіць навука пра тое, як уладкаваны свет? Можа быць, не ўсім трэба ведаць, як адбываецца ядзерная рэакцыя, але ж ёсць элементарныя законы гэтай навукі, без ведання якіх праблематычна жыць. Усё, што нас акружае, — гэта фізіка. І ўся тэхніка, якой мы карыстаемся, была створана фізікамі. Мала хто ўнікае, як яна працуе, аднак усе ахвотна карыстаюцца выгодамі цывілізацыі. Як кажуць мае бацькі, «проста не вучы фізіку ў школе, і ўсё тваё жыццё будзе напоўнена цудамі і чараўніцтвам».

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



**На міжнародным конкурсе навукова-тэхнічных работ школьнікаў «Вучоныя будучыні» Яраслаў Якубоўскі заваяваў дыплом другой ступені.**

На слыху

# Сем крокаў да школы, свабоднай ад гвалту

### Чаму цкаванне ні ў якім разе нельга разглядаць як школу жыцця?

**«Булінг — не тая праблема, якую можна вырашыць раз і назаўжды, гэта больш падобна на пустазелле, яго трэба рэгулярна праполваць, адначасова клапоцячыся пра сад і прышчапляючы здаровыя парасткі», — такую думку выказала ў адным са сваіх інтэрв'ю вядомы расійскі псіхолаг Людміла ПЕТРАНОЎСКАЯ.**

З гэтай сацыяльнай з'явай даўно спрабуюць змагацца ва ўсім свеце, а першая праграма па барацьбе з булінгам і яго наступствамі з'явілася ў Нарвегіі яшчэ ў 1980-я гады. Такой была рэакцыя Міністэрства адукацыі на трагічнае здарэнне — суіцыд трох падлеткаў, якія сутыкнуліся са здзекамі ў школе. У 1991 годзе была праведзена ацэнка эфектыўнасці праграмы, якая паказала факт зніжэння ганенняў на 50 працэнтаў.

У 2009 годзе ў Фінляндыі запусцілі антыбулінгавую праграму KiVa, скіраваную на сведак цкавання. У яе аснове — кіраванне эмоцыямі, развіццё высокага ўзроўню эмпатыі (спагады) сярод школьнікаў і ўменне вырашаць канфлікты мірна. Гэтую праграму ўзялі на ўзбраенне ў Італіі, Бельгіі, Нідэрландах, краінах Лацінскай Амерыкі, Эстоніі і іншых дзяржавах.

У многіх еўрапейскіх краінах сталі традыцыйнымі антыбулінгавыя марафоны і тыдні. Адзначаюцца Дзень талерантнасці, Дзень рознакаляровых шкарпэтак, калі дзеці прыходзяць у розных шкарпэтках і расказваюць адно аднаму пра тое, чым яны адрозніваюцца. Гэта не нейкія аднаразовыя акцыі, а пастаянная работа.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



# Сем крокаў да школы, свабоднай ад гвалту

## Не вынаходзіць веласіпед

У новым навучальным годзе і ў беларускіх школах пачнуць мэтанакіравана працаваць на прадухіленне псіхічнага і фізічнага гвалту. Беларуская мадэль з'яўляецца вынікам навукова-даследчай работы па адаптацыі харвацкай мадэлі «Бяспечнае і падтрымліваючае асяроддзе ў школах», якую правёў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка ў партнёрстве з ЮНІСЕФ і пры фінансавай падтрымцы фонду «Польская дапамога» пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Польшча. У рамках эксперыментальнай дзейнасці будзе ўкараняцца мадэль «Дружалюбнае адукацыйнае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі», а пляцоўкай для апрабацыі стануць 26 школ у розных рэгіёнах нашай краіны.

— Аргументам у падтрымку ўкаранення нацыянальнай мадэлі з'яўляюцца звароты, якія паступаюць у міністэрства ў выніку канфліктных сітуацый, — расказаў падчас яе анлайн-прэзентацыі **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ**. — Па шэрагу выпадкаў ствараліся рабочыя групы і камісіі, у якіх бралі ўдзел педагогі-псіхолагі Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі. Па выніках іх работы было вызначана, што адной з прычын канфліктаў з'яўляецца менавіта булінг. З кастрычніка да мая на базе цэнтра рэалізоўвалася вучэбная праграма для рэгіянальных педагогаў-псіхолагаў, псіхолагаў устаноў адукацыі па аказанні дапамогі ў крызісных сітуацыях, у тым ліку булінгу. Навучанне прайшлі 125 спецыялістаў.

**«Калі мы не рэагуем, значыць, мы ўхваляем».**

— Сённяшнія падлеткі заўтра стануць дарослымі людзьмі, — падкрэслівае **прадстаўнік ЮНІСЕФ у Беларусі Рашэд Мустафа САРВАР**, — і тыя мадэлі паводзін, якія ім заклалі ў дзяцінстве, якія яны бачылі вакол сябе, стануць іх паводзінамі ў дарослым жыцці. Ідэя праекта заключаецца ў тым, каб людзі выраслі фізічна і псіхалагічна здаровымі. Вырашаць праблему трэба сістэмна, выкарыстоўваючы інструменты медыяцыі і аднаўленчага правасуддзя. Таксама вельмі важны ўдзел грамадства, каб пазбегнуць стыгматызацыі тых дзяцей, якія сталі агрэсарамі або ахвярамі булінгу. Важны кампанент — партнёрства педагогаў, дзяцей і бацькоў. Не трэба вынаходзіць веласіпед, варта проста пераняць паспяховы вопыт, у нашым выпадку — вопыт Харватыі.

## Матывацыя агрэсараў

Як расказала прафесар псіхалогіі з гэтай краіны Ясенка Прэград, у іх, перш чым пачаць укараняць антыбулінгавую праграму ў школах, запусцілі магутную інфармацыйную кампанію, каб заручыцца падтрымкай грамадскасці: на вуліцах устанаўліваліся білборды з надпісамі кшталту: «Грубае слова параніць мацней, чым аплявуха», «Апошні ў чарзе, першы ў сіняках», «Стадыён без грубасці, школы без гвалту» і г.д., выкарыстоўваліся сродкі масавай інфармацыі. Асветніцкая праграма дазволіла прыцягнуць ментараў і распачаць збор сродкаў. Можна было патэлефанаваць на пэўны нумар, каб з твайго тэлефона спісалі сродкі на карысць кампаніі. Спачатку антыбулінгавая мадэль апрабавалася на базе трох школ, а затым ужо іх вопыт маштабаваі на іншыя. Дзяцей і педагогаў вучылі, як вырашаць канфлікты негвалтоўнымі дзеяннямі. Хутка высветлілася, што сведкі булінгу проста пасавалі перад булерамі, упэўненыя ў тым, што тыя маюць сілу. Ужо праз тры гады рэалізацыі кампаніі ўзровень булінгу ў харвацкіх школах знізіўся ўдвая.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)



**Будзь у курсе!**

**Як адрозніць булінг ад канфлікту? У першым выпадку існуе дысбаланс улады: хтосьці валодае пэўнымі якасцямі або статусам, якія даюць яму адчуванне перавагі над іншым. У канфлікце ўзаемадзейнічаюць роўныя. Адбываецца сутыкненне іх інтарэсаў, абодва адстойваюць свой пункт гледжання і даюць здачы. Булінг — гэта наўмыснае дзеянне, у адрозненне ад канфлікту: канфлікт не плануюць, ён здараецца.**

Між іншым, па ўсіх булінг-даследаваннях, не меншую, а можа, яшчэ і больш значную ролю іграюць так званыя сведкі булінгу, гэта значыць людзі, якія не цкуюць самі, але пры гэтым прысутнічаюць. Сведкі — цэнтральнае звяно, якое ўплывае на раздзіманне булінгу, таму што агрэсары (булеры) насамрэч дзейнічаюць з матывацыяй атрымання сацыяльнага адабрэння, павышэння свайго сацыяльнага статусу, а гэта немагчыма без падтрымкі навакольных.

## Сведкі і ахвяры

— Яшчэ на першым этапе рэалізацыі праекта, калі мы выходзілі ў школы для апрабацыі яго практычнай часткі, стала зразумела, што ні бацькі, ні педагогі, ні самі вучні не валодаюць неабходнымі ведамі пра формы гвалту і не ведаюць, як рэагаваць у сітуацыі булінгу ў школьным асяроддзі, — расказала **начальнік Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі Інстытута псіхалогіі БДПУ Вольга МАЦЮХОВА**. — Яны блыталі такія паняцці, як канфлікт і булінг. Больш таго, дзеці не могуць адрозніць здзек ад жарту. Калі аднакласнікі замыкаюць кагосьці ў распранальні, як гэта расцэньваць: як здзек ці як жарт? Дзеці лічаць такія дзеянні жартам, але жарт — гэта калі смешна ўсім.

Як практык магу сказаць, што з агульнай колькасці зваротаў у наш цэнтр булінг, кібербулінг і канфлікты займаюць вядучую пазіцыю, таму школа павінна стаць пляцоўкай для прэвентыўных мерапрыемстваў. У аснову нашай мадэлі пакладзены агульначалавечыя каштоўнасці, а ў фокусе ўвагі знаходзяцца патрэбы нашых вучняў. Забяспечыць у школе бяспечнае псіхалагічнае асяроддзе — гэта задача дарослых, і абсалютна недапушчальна трансліраваць думку, што булінг — гэта школа жыцця. На жаль, некаторыя педагогі праяўляюць талерантнасць да гвалтоўных дзеянняў у камунікацыі паміж дзецьмі, аргументуючы гэта тым, што трэба вучыцца вырашаць праблемы самастойна. А калі мы не рэагуем, значыць, мы ўхваляем. Цкаванне, скіраванае на аднаго з вучняў, уплывае не толькі на ахвяру, але і на крыўдзіцеляў, і на сведак, і можа прывесці да трагічных падзей.

## Архіважная роля педагогаў

Як правіла, усё пачынаецца з абраз, а далей агрэсары намацоўваюць глебу: могуць байкатаваць, ігнараваць, выключаць з гульняў, псаваць рэчы, падкладаць штонебудзь і потым казаць, што «ён (яна) скраў (скрала) нашы рэчы». Прычыны заўсёды розныя. Раней лічылася, што цкаванне пачынаецца, калі прыходзіць вучань, які рэзка адрозніваецца ад усёй астатняй групы і тая, каб захаваць сваю цэласнасць, пачынае яго выганяць. Але цкаваць могуць і актыўных і таварыскіх дзяцей. Праблема не ў канкрэтным вучні, а ў тым, што так паводзіць сябе з аднакласнікамі лічыцца дапушчальным. Галоўнае — як будзе ставіцца да гэтага настаўнік: спыніць ён ці не? Таму што калі дзяцей ніхто не спыняе, то яны думаюць: «Усё нармальна, мы нічога дрэннага не робім».

У кожнай сітуацыі шмат залежыць ад канкрэтнага педагога: хтосьці рэагуе і ведае, як сябе паводзіць, а хтосьці не ведае ці не мае аўтарытэту ў вучняў. Між іншым, настаўнікі павінны адрозніваць сітуацыі, калі дзеці проста з-за чагосьці не паладзілі, ад булінгу.

— Матывацыя да ўдзелу ў праграме ў вучняў наўпрост залежыць ад уключанасці ў яе адміністрацыі і класных кіраўнікоў, — падкрэслівае **загадчык кафедры псіхалогіі адукацыі Інстытута псіхалогіі БДПУ, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт Ала МУЗЫЧЭНКА**. — На шляху да бяспечнай школы будзе сем крокаў — сем этапаў рэалізацыі нашай праграмы: ад інфармавання ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу пра гвалт, стварэння экасістэмы каштоўнасцяў у школьным калектыве, вызначэння правіл паводзін, укаранення негвалтоўных метадаў выпраўлення памылкі (маецца на ўвазе метад аднаўлення каштоўнасцяў) да пашырэння магчымасцяў сяброўскага асяроддзя і стварэння сістэмы дыферэнцыяванай дапамогі навучэнцам. Спадзяёмся, што ўкараненне мадэлі будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў школ узаемнай павагі, уключэнню ў працэс прафілактыкі гвалту бацькоў, настаўнікаў і прадстаўнікоў мясцовых органаў улады. Рабоце з бацькамі адводзіцца вельмі важная роля, бо калі ў школе ўкараняюцца адны каштоўнасці, а ў сям'і — іншыя, то, нават нягледзячы на аўтарытэт педагога, дамагчыся чаканага эфекту будзе праблематычна.

## Талерантнасць да гвалту

Праект будзе рэалізоўвацца пры ўдзеле ментараў — пазаштатных удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Такая пазіцыя мае перавагі, якія заключаюцца ў даверным узаемадзеянні з работнікамі, дзецьмі і бацькамі, бо ментар не ўключаны непасрэдна ў сістэму субардынацыі і прафесійных адносін унутры школы і мае магчымасць захоўваць свежы погляд на звыклыя для калектыву з'явы.

Як заўважыла Ала Музычэнка, «мы сутыкнуліся з тым, што ў школьных калектывах ёсць прыкыванне да неспрыяльных сітуацый, але гвалт меж не ведае, і калі толькі яго дапусціць, ён абавязкова пяройдзе ўсе межы».

Некаторыя кампаненты мадэлі тэсціраваліся ў шэрагу сталічных школ у першым паўгоддзі гэтага года, праўда, пандэмія і тут унесла пэўныя карэктывы. Шмат мерапрыемстваў давялося перавесці ў анлайн.

Падчас ананімнага анкетавання для высвятлення рызыкі булінгу навучэнцам, у прыватнасці, прапаноўвалася адказаць на наступныя пытанні. Ці бываець у школе сітуацыі агрэсіі, ганення кагосьці, знявагі? З боку каго? З кім можна абмеркаваць гэтую праблему? Хто зразумее? Што адбываецца ў школе з тым, хто жорстка абыходзіцца з іншымі? Калі здарыцца так, што цябе станучь зневажаць, да каго ты звернешся? Калі ўбачыш, што са школьніка здзекуюцца, што зробіш? Калі звернешся па дапамогу, табе насамрэч дапамогуць? Аналіз адказаў паказаў, што ёсць у школах праблемы і з бяспекай, і з раз'яднанасцю, і з раўнапраўем у калектывах (магчымасцю свабодна выказвацца ў любых сітуацыях). Ёсць і дзеці, якія становяцца аб'ектамі для здзекаў і кпін.

— Нягледзячы на тое, што праблема булінгу сёння знаходзіцца ў цэнтры ўвагі СМІ і інфармацыі па гэтай праблеме нібыта бы дастаткова, мы заўважылі, што няўменне педагогаў і бацькоў адрозніваць канфліктныя сітуацыі ад булінгу цягне пэўныя наступствы, — канстатуе **адзін з ментараў праграмы, псіхолаг Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі Ілляна МАТВІЕНКА**. — Дарослыя ўпэўнены, што дзеці павінны самі навучыцца вырашаць канфліктныя сітуацыі, і гэта насамрэч так. Але і булінг яны разглядаюць часта як звычайны канфлікт, а ў гэтай сітуацыі малым патрабуецца дапамога дарослых. І наадварот, дарослыя ўмешваюцца ў канфлікт, пазбаўляючы такім чынам дзіця магчымасці самому знайсці спосабы яго вырашэння.

**Сведкі — цэнтральнае звяно, якое ўплывае на раздзіманне булінгу.**

Кантактуючы са школьнікамі, мы таксама заўважылі, што фон для абмеркавання праблемы булінгу ў розных узроставых групах не супадае: так, для вучняў пятых—шостых класаў вельмі яркімі былі пытанні сяброўства і бяспекі, а старшакласнікі праецыравалі тэму на сваё развіццё, будучыню і нават прафесійную самарэалізацыю. У адным з класаў навучэнцы нават ініцыявалі дыскусію на тэму, якім кіраўніком можа стаць чалавек, які ўзяў на сябе ролю агрэсара і буліць сёння іншых. Ці будзе ўвогуле паспяховым чалавек з агрэсіўнай мадэллю паводзін?

Ілляна Матвіенка падкрэслівае, што перавага нацыянальнай антыбулінгавай мадэлі — у яе прафілактычнай накіраванасці: яна дапамагае падтрымліваць спрыяльнае асяроддзе ў школьных калектывах і не даваць развіцца негатыўным тэндэнцыям. Дарэчы, як паказалі вынікі праведзенага анкетавання, 46,2 працэнта апытаных навучэнцаў ацэньваюць псіхалагічны клімат у сваім класе як спрыяльны. Прыкладна столькі ж навучэнцаў паведамілі, што абыякава ставяцца да псіхалагічнага клімату ў калектыве, пытанне адносін у класе для іх не прыярытэтнае. А 7,6 працэнта ацэньваюць псіхалагічны клімат як неспрыяльны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

**Будзь у курсе!**

**Пад булінгам разумеюць сістэматычны пераслед каго-небудзь групай або асобным чалавекам, псіхалагічны і (ці) фізічны. Фізічны гвалт праяўляецца ў выглядзе шморганняў за валасы, удараў, збіцця, штуршкоў, выспяткаў і г. д. Псіхалагічны гвалт можа праяўляцца ў выглядзе абраз, ігнаравання, кпін, надання мянушак, прымусу да нежаданых дзеянняў, ізаляцыі ад калектыву.**

*Камандны дух*

# КІЛАМЕТРЫ ДАРОГ І ЗАПЛЕЧНІК СТАНОЎЧЫХ ЭМОЦЫЙ,

## або Працягваючы добрую машэраўскую традыцыю

**Ужо больш за дваццаць гадоў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава існуе цудоўная традыцыя — збірацца ў паходы. Яны прысвечаныя памяці былога студэнта гэтай установы Пятра Міронавіча Машэрава, які калісьці быў пачынальнікам і арганізатарам першага лыжнага паходу, прымеркаванага да 20-годдзя Чырвонай Арміі. Тады маршрут быў ваенізаваны і пралягаў праз Віцебск — Оршу — Магілёў — Мінск. Падчас яго праводзіліся спаборніцтвы па стральбе, бегу на лыжах.**

**Цяпер жа сярод удзельнікаў такога мерапрыемства, акрамя студэнтаў, можна ўбачыць і магістрантаў, і аспірантаў, і выкладчыкаў з розных факультэтаў, з рознымі захапленнямі, але ўсіх іх яднае любоў да паходаў.**

**Традыцыя адрадзілася ў 1998 годзе дзякуючы старшаму выкладчыку кафедры фізічнага выхавання і спорту Андрэю СЕРАБРАКОВУ. На пытанне, як узнікла ідэя хадзіць у паходы, ён адказаў, што пасля першага ж вопыту ў яго з'явілася моцнае жаданне зноў адправіцца ў шлях. Аднак толькі цяпер кіраўнік разумее, як цяжка арганізаваць такое мерапрыемства.**



Андрэй Серабракоў атрымлівае ўзнагароду ад універсітэта як пераможца ў намінацыі «За ўнёсак у патрыятычнае выхаванне», 2019 год.

Паходы адбываюцца ўвосень і ўзімку. Восеньскія пешыя маршруты звычайна доўжацца на працягу двух-трох дзён. Загадзя агучваюцца план і схема руху, вызначаюцца месца для прывалу, колькасць кіламетраў, якія трэба прайсці. У абмеркаванні і планаванні мерапрыемства на пачатковым этапе ўдзельнічаюць і самі студэнты, што, бясспрэчна, развівае іх арганізацыйныя здольнасці. У паходзе кожны бярэ на сябе пэўную ролю: хтосьці адказвае за харчаванне, кагосьці абіраюць капітанам валейбольнай каманды, абавязкова прызначаюцца дзяжурныя. Традыцыйна наведваецца Сенненскі раён — радзіма Машэрава — вёскі Машканы і Шыркі: у першай знаходзіцца школа, у якой вучыўся Пётр Машэраў, а ў другой стаіць яго родная хата.

Зімой машэраўцы рыхтуюцца да трох-чатырохдзённага лыжнага паходу. Іх маршрут пралягае па Расонскім раёне, што на Віцебшчыне. Менавіта сюды ў далёкім 1933-м пераехала сям'я Машэравых, а пасля ў гэтых мясцінах Пётр Міронавіч працаваў настаўнікам. Тут у гады Вялікай Айчыннай будучы першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі стварыў і ўзначаліў камсамольска-маладзёжнае падполле, адначасова пад імем Дубняк займаўся арганізацыяй партызанскага руху. У 2019 годзе ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ў памяць аб суайчынніку юнымі паслядоўнікамі Машэрава была пасаджана дубовая алея на тэрыторыі дома-музея партызанскай славы ў вёсцы Межна.



Менавіта ў дарозе група з дзесяці-пятнаццаці чалавек становіцца адзінай згуртаванай камандай, дзе ўсе разам вучацца жыць у прыродных умовах, удзельнічаюць у спартыўных спаборніцтвах, ствараюць творчыя нумары. Умовы экспедыцыі дапамагаюць удзельнікам раскрываць у сабе схаваныя таленты, развіваць сілу волі, калектывізм, таварыскасць, уменне прыйсці на дапамогу. Наведваючы мясціны, звязаныя з лёсам Пятра Міронавіча, віцебскія патрыёты аказваюць дапамогу пажылым і адзінокім, акультурваюць помнікі загінулым у Вялікай Айчыннай вайне. Хлопцы і дзяўчаты праводзяць сур'ёзную работу: ачышчаюць бетонныя надпісы, мыюць гранітныя пліты, фарбуюць агароджы, наводзяць парадак вакол помнікаў, магіл невядомым салдатам, адбываецца ўрачыстае ўскладанне кветак.

Кожны чарговы паход — гэта зборная каманда з так званымі навічкамі і бывалымі, якія добра ведаюць гэтую «кухню» і могуць падказаць тое-сёе маладым, дапамагчы адаптавацца ў неспрыяльных умовах. Начлег праводзяць у прыватных дамах альбо памяшканнях, што выдзяляюць установы адукацыі. Калі паходная каманда размяшчаецца ў прыватным доме, то студэнты абавязкова аказваюць гаспадару неабходную дапамогу: носяць ваду, колюць дровы, расчышчаюць снег. Для прадстаўнікоў універсітэта мясцовыя школьнікі праводзяць цікавыя экскурсіі, арганізоўваюць дыскатэкі, ладзяць таварыскія спаборніцтвы паміж юнымі выхаванцамі ўстановы і гасцямі, абмен літаратурай і многае іншае.

— Не заўсёды ўсё запланаванае арганізатарамі праходзіла як мае быць, адбываліся і форс-мажорныя сітуацыі, — дзеліцца ўспамінамі Андрэй Іосіфавіч. — Нярэдка бывала, што падводзілі тыя, з кім дамаўляліся пра начлег у зімовы перыяд, калі не выкарыстоўваюцца палаткі. Даводзілася хутка шукаць выйсце.

Самае цікавае, — па словах адной з удзельніц былых паходаў, колішняй студэнткі Святланы Сідаравай, — гэта сама лыжная хада па лесе, возеры, калі кожны суладна ідзе адзін за адным. Маладыя людзі пераадольваюць вялікую адлегласць. Канешне, іх суправаджае транспарт. Звычайна гэта аўтобус, што прывозіць каманду да пэўнага месца, з якога пачынаецца маршрут, і чакае ўсіх на канчатковым пункце. Вядома, не ўсе могуць разлічыць свае сілы: прайсці не адзін дзесятак кіламетраў у грувасткім адзенні з вялікім заплечнікам, ды яшчэ на лыжах, не кожнаму пад сілу. Трэба разумець, што зіма, лёд, снег, колкі вецер у твар — не вельмі спрыяльныя ўмовы для гарадскога жыхара, які ўпершыню ў сваім жыцці аказаўся ў паходзе. І таму, калі чалавек разумее, што яму складана ісці з усімі, наступным разам ён можа застацца ў аўтобусе, напрыклад, у якасці кухара. На ім будуць гаспадарчыя абавязкі — развядзенне вогнішча, прыгатаванне вячэры і іншыя справы.

Можна ўявіць, як прыемна камандзе вяртацца да прыстанку, дзе ўжо чакаюць гарачая каша, духмяная юшка і падрыхтаваны лагер! А пасля паходнай вячэры гучаць песні і цікавыя гісторыі ля агульнага вогнішча... Уся стомленасць адразу знікае.

Падобныя патрыятычныя вандроўкі з'яўляюцца аддушынай для рознаўзроставых удзельнікаў, своеасаблівым перапынкам паміж штодзённымі аўдыторскімі буднямі. Машэраўцы расказваюць, што ў паходзе яны быццам пераносяцца ў далёкае мінулае сваіх бацькоў з піянерскімі вогнішчамі і гітарай, адначасова з гэтым кожны адчувае свой значны ўнёсак у агульную справу.

Па словах кіраўніка і арганізатара Андрэя Серабракова, усё больш людзей, якія хоць аднойчы пабывалі ў такім паходзе, не могуць адмовіцца наступны раз.

Сёння паміж былымі студэнтамі ВНУ склалася новая традыцыя: кіраўнік паходаў збірае раз на пяць гадоў усіх сваіх выпускнікоў, якія хадзілі з ім у вандроўкі. І сёлета якраз адбудзецца такая сустрэча, дзе будуць згадвацца самыя цудоўныя моманты спартыўнага мінулага, паходы, падчас якіх многія знайшлі сапраўдных сяброў, сваё каханне. І, нягледзячы на занятасць, пасады і ўзрост, дарослыя машэраўцы з задавальненнем гуляюць у валейбол і праспяваюць песні каля вогнішча. Яны падтрымліваюць гэтую традыцыю, бо любоў да паходаў, прывітая мудрым кіраўніком у студэнцтве, застаецца назаўсёды.

**Надзея ЗУЕВА,**
*г. Віцебск.*

**Фота дадзена ВДУ імя П. М. Машэрава і ўдзельнікамі паходаў.**

*Новыя старты*

# ЯК Я ПРАВЕЎ ЖНІВЕНЬ

**Стартаваў праект «PROлета з БДУ». Удзельнікамі акцыі могуць стаць усе ахвотныя студэнты і супрацоўнікі універсітэта.**

Праект пройдзе ў фармаце спаборніцтваў у два этапы: адборачны і фінальны. Першы арганізуецца з 3 да 28 жніўня і ўключае чатыры тэматыкі: спартыўную, кулінарную, б'юці і блогасферу. Удзельнікі выбіраюць адну з іх і выконваюць заданні з улікам яе спецыфікі. Напрыклад, у спартыўным блоку могуць прапанаваць зрабіць акрабатычны трук, у кулінарным — спячы торт, у б'юці — вырабіць акцэнтны макіяж, а ў блогасферы — стварыць унікальны відэакантэнт пра родны горад.

Заданні будуць даступныя ў пачатку кожнага тыдня. Вынікі трэба размясціць у сваім акаўнце ў сацыяльных сетках «УКантакце», Instagram або Twitter пад хэштэгамі #летоспрофкомомбгу і #proлето, а таксама даслаць на электронную скрыню пярвічнай прафсаюзнай студэнцкай арганізацыі БДУ. Ацэнку выкананым работам дадуць запрошаныя эксперты.

У канцы першага тура ў пачатку верасня вызначаць восем фіналістаў. У складзе дзвюх камандаў яны павінны будуць прайсці квэст з творчымі заданнямі. Усіх фіналістаў узнагародзяць каштоўнымі падарункамі.

Арганізатарам праекта выступае пярвічная прафсаюзная студэнцкая арганізацыя БДУ.

Дадатковая інфармацыя пра конкурс даступная ў афіцыйных групах пярвічнай прафсаюзнай студэнцкай арганізацыі БДУ «УКантакце», а таксама ў Instagram і Twitter.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У актыўным рытме*

# ТАНЦЫ Ў...ІНТЭРНЭЦЕ

**Танцавальны калектыў БДПУ «Арт-Юніці» стаў прызёрам першага міжнароднага танцавальнага інтэрнэт-конкурсу Global Internet Dance — 2020. Гэта новы фармат традыцыйнага міжнароднага танцавальнага фестывалю Global Dance.**

У конкурсе ўзялі ўдзел больш за 1500 танцораў з Беларусі, Расіі, Узбекістана, Украіны і Эстоніі. У адрозненне ад папярэдніх гадоў, сёлета яны не выступалі перад журы непасрэдна, а дасылалі відэа сваіх танцавальных нумароў.

«Арт-Юніці» прадставіў на конкурс тры нумары — «У цяжкую хвіліну», Inred і Saymyname. У выніку танцавальны нумар «У цяжкую хвіліну» заняў першае месца ў намінацыі «Танцавальнае шоу». Журы высока ацаніла яго кампазіцыю, відовішчнасць і тэхніку выканаўцаў. Нумар Inred заваяваў другое месца ў намінацыі Streetshow, а Saymyname — другое месца ў намінацыі Flashmob.

Арганізатарамі міжнароднага танцавальнага фестывалю выступаюць школа танцаў «Вінт-КЛАБ» (Беларусь) і маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Танцавальны рух» (Беларусь).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ТРАПІЦЬ У ПАЛОН ДА... ФІЗІКІ

## Першыя крокі

Дарэчы, фізіку ў гімназіі Яраславу выкладала яго маці — Эла Мікалаеўна Якубоўская. Яго бацька Аляксандр Уладзіміравіч Якубоўскі — таксама настаўнік фізікі ў адной з жодзінскіх школ.

— І мой брат скончыў факультэт радыёфізікі БДУ. Як вы разумееце, выбару ў мяне не было, — жартуе хлопец. — Фізіка акружала мяне з самага дзяцінства, і я з нецярплівасцю чакаў, калі ў школьнай праграме нарэшце з'явіцца гэты прадмет. А ў восьмым класе захапіўся даследчай работай і пачаў асвойваць новае для мяне поле дзейнасці — навукова-даследчыя канферэнцыі і конкурсы. І ўжо першая спроба аказалася ўдалай. На навукова-інжынерным конкурсе для навучэнцаў Belarus Science and Engineering Fair са сваім дамашнім кандыцыянерам адразу атрымаў дыплом другой ступені. Я прапанаваў дзве мадэлі з падручных сродкаў: у ход пайшлі бутэлька з лёдам, кулеры ад камп'ютарнага працэсара і нават прапелер з CD-дыскаў. Сёння тыя прыстасаванні выглядаюць дзіўна, але для падлетка гэта было проста «вау»!

На наступны год Яраслаў зноў удзельнічаў у конкурсе Belarus Science and Engineering Fair і зноў атрымаў дыплом другой ступені са сваёй работай «Вывучэнне слізгальнага разраду па паверхні вадкасці». А затым электрычнасць проста ўзяла яго ў палон.

— На сённяшні дзень гэта яго любімы раздзел фізікі, а нелюбімы — малекулярная фізіка. Таму што там пераважна тэорыя, а я люблю практыку — тое, што можна памацаць, праверыць, паставіць эксперымент, — тлумачыць хлопец.

## Міжнароднае прызнанне

Уздзеянне слізгальнага разраду па паверхні вадкасці ён вывучае ўжо некалькі гадоў, дапаўняючы сваю даследчую працу ўсё новымі эксперыментамі. Дзесяцікласнікам выступаў з гэтай тэмай на XXIII рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару, дзе яго намаганні былі адзначаны дыпломам трэцяй ступені. Марай было трапіць на міжнародны конкурс навукова-тэхнічных работ школьнікаў «Вучоныя будучыні», які праходзіць у Маскве ў рамках Усерасійскага фестывалю навукі. Сам фестываль — гэта проста грандыёзная падзея, якую трэба хоць аднойчы наведаць. А заявак на конкурс прыходзіць больш за тысячу, з іх адбіраюць для ўдзелу ў фінале толькі сто. Таму запрашэнне ў фінальную частку міжнароднага спаборніцтва, якое прыйшло Яраславу ў верасні мінулага года, ужо можна было лічыць перамогай. У секцыі, дзе была прадстаўлена работа беларускага гімназіста па даследаванні слізгальнага разраду, удзельнічалі са сваімі даследчымі работамі і кітайцы, і іранцы, і сербы. Але Яраслаў не разгубіўся і заваяваў у расійскай сталіцы дыплом другой ступені. Прызнаецца, што для яго гэта быў выдатны досвед спаборніцтва і знаёмства з такімі ж, як і ён, апантанымі людзьмі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



**Для юнага даследчыка найбольш блізкая стэндавая абарона дакладаў. Стэнд — інструмент, які трэба добра прадумаць.**

Пасля ў сям'і Якубоўскіх вырашылі ўзяць паўзу, каб засяродзіцца ў выпускным класе на падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання, але бліжэй да новага года выпускнік і яго навуковы кіраўнік, у ролі якога заўсёды выступала маці, засумавалі і сталі шукаць тэму для ўдзелу ў XXIV рэспубліканскім конкурсе. У выніку работа Яраслава «Вызначэнне структуры па дыфракцыйным малюнку» заваявала там дыплом другой ступені. Юны даследчык прасвечваў птушыныя пяро і па дыфракцыйным малюнку, які атрымліваў у ходзе эксперымента, змог расказаць, што ў ім утрымліваецца.

**«Заўсёды будуць патрэбныя людзі, якія пішуць коды. А я хачу займацца «жалезам».**

Але і на гэтым дасягненні жодзінскі гімназіст не спыніўся. На Міжнароднай навуковай канферэнцыі школьнікаў «XXX Сахараўскія чытанні» ў Санкт-Пецярбургу, якая прайшла ў канцы вясны, ён зноў атрымаў за вывучэнне слізгальнага разраду па паверхні вадкасці дыплом другой ступені. Праўда, з-за пандэміі фармат канферэнцыі давялося сёлета змяніць, таму ўбачыць белыя ночы хлопцу і яго маці пакуль так і не давялося, хоць яны вельмі на тое разлічвалі. Канкурсантам, акрамя тэзісаў, трэба было зняць і даслаць журы відэаролік — прэзентацыю сваёй работы: коратка пераказаць яе сутнасць і вынікі, якія былі атрыманыя.

— Упершыню карцінку размеркавання разраду іскры па паверхні цвёрдага дыэлектрыка назіраў Георг Крыстаф Ліхтэнберг у 1777 годзе, але высветлілася, што разрад можа слізгаць не толькі па цвёрдых, але і па вадкіх дыэлектрыках, — тлумачыць сутнасць свайго даследавання Яраслаў. — Таму мэтай маёй работы стала вывучэнне залежнасцяў незавершанага слізгальнага разраду па паверхні вадкасці і пастаўлены наступныя задачы: правесці аналіз звестак аб тэхналогіях стварэння слізгальнага разраду, стварыць устаноўку для вывучэння паверхневага разраду ў вадкасці, атрымаць залежнасці характарыстык разраду ад розных фактараў, вывучыць яго паводзіны ў моцным магнітным полі і вызначыць магчымасць выкарыстання разраду для ачышчэння вады ад нафтапрадуктаў. Апошні пункт, на мой погляд, можа ўяўляць практычны інтарэс. Гэта не проста навука дзеля навукі.

*— А як ты ўвогуле знаходзіш тэмы для сваіх даследчых работ?* — пацікавіліся мы ў маладога чалавека.

— Гэта наш сумесны пошук. Я шукаю, і маці шукае. Мы раімся, вывучаем тэмы, якія ўжо былі на папярэдніх канферэнцыях, каб не паўтарацца. Хачу заўважыць, што ў навуковых канферэнцыях у школьныя гады ўдзельнічаў і мой старэйшы брат. За пяць-шэсць гадоў, якія прайшлі з тых часоў, было прадстаўлена вельмі шмат тэм, таму знайсці штосьці свежае і новае ўсё больш праблематычна. Вывучаем адкрыцці ў сферы навукі, актуальныя кірункі і адштурхоўваемся ад гэтых пошукаў.

*— А ці не даводзілася чуць папрокі кшталту таго, што за ўсімі тваімі даследаваннямі стаіць твая маці? Усё ж такі настаўніцкім дзецям пастаянна трэба штосьці даказваць,* — зноў пытаемся мы.

— Ну, па-першае, ніхто дзіцяці такога адкрыта не скажа, — не крыўдзіцца на наша пытанне Яраслаў. — А па-другое, вельмі проста ўстанавіць, хто насамрэч рабіў даследчую работу, — па ўзроўні яе разумення. Члены журы задаюць табе канкрэтныя пытанні, і калі ты проста завучыў падрыхтаваны тэкст, не ведаеш нюансы праекта, не можаш дакладна апісаць ход даследавання і растлумачыць яго вынікі, гэта вельмі хутка высвятляецца. Калі мая работа ў дзявятым класе датычылася раздзела, які вывучаўся ў школе толькі ў дзясятым класе, я вельмі добра рыхтаваўся па тэорыі. Каб ні ў кога не ўзнікла сумненняў!

## Уменне сябе прэзентаваць

Юны даследчык прызнаецца, што для яго найбліжэйшая стэндавая абарона дакладаў, якая дае магчымасць зносін не толькі з членамі журы, але і з вялікай колькасцю іншых дакладчыкаў, выкладчыкамі і студэнтамі ВНУ, прадстаўнікамі бізнесу.

— Ёсць маладзёжнае і навуковае журы. Да цябе можа падысці адзін член журы або адразу некалькі. Ты павінен расказаць яму коратка сутнасць сваёй работы, выкарыстоўваючы стэндавую прэзентацыю, — тлумачыць хлопец. — Стэнд — гэта твой інструмент, таму яго трэба добра прадумаць. Мая задача — расказаць самае каштоўнае, каб зацікавіць і зачапіць. Напрыклад, калі да цябе падыходзіць не фізік, а хімік, ты робіш упор на тую частку даследавання, якая можа быць цікавая менавіта яму. У Маскве я камунікаваў з выкладчыкамі МДУ і Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута. А з навуковым кіраўніком адной з даследчых работ у нас атрымалася вельмі цікавая дыскусія: у маім даследаванні было адно нявырашанае пытанне з бар'ерным разрадам, і мы разам з ім шукалі спосабы яго вырашэння. Ён прапанаваў цікавую ідэю, і, калі будзе адпаведнае абсталяванне, яе можна будзе праверыць.

Яшчэ тры гады таму я нават не мог падумаць, што змагу так спакойна выступаць і выкладаць свае думкі. Добра пастаўленая мова, уменне дакладна і лаканічна адказваць на пытанні, правільна сябе прэзентаваць — вельмі каштоўныя ўменні. Нават калі ты выступаеш з дакладам, то ўсё роўна табе адводзіцца максімум 10 хвілін і за рэгламентам вельмі пільна сочаць. Калі не ўпісаўся ў адведзеныя рамкі — гэта твая праблема, цябе ўсё роўна спыняюць і пачынаюць задаваць пытанні.

## Карыснае хобі

Гімназію Яраслаў скончыў з залатым медалём і сярэднім балам атэстата 9,7. «Дзявяткі» ў яго па рускай і беларускай мовах, хіміі, біялогіі і сусветнай гісторыі. Затое на цэнтралізаваным тэсціраванні па рускай мове ён набраў 96 балаў, а па беларускай мове — 82. У сям'і нават жартавалі, што, можа быць, ён памыліўся са сваёй прафесійнай будучыняй. Прызнаецца, што да ЦТ па рускай мове рыхтаваўся з рэпетытарам, а беларускую мову, матэматыку і фізіку здаваў без прыцягнення знешняй дапамогі. Рыхтавацца па матэматыцы дапамагала школьная настаўніца Тамара Дзмітрыеўна Серада ў рамках дадатковых заняткаў. Па фізіцы шмат рашаў тэстаў за папярэднія гады і трэніраваўся на інтэрнэт-рэсурсах educon.by і web-physics.ru. У выніку ў яго 94 бала на ЦТ па матэматыцы і 96 балаў — на ЦТ па фізіцы. Хоць, як прызнаецца выпускнік, змест ЦТ па фізіцы стаў для яго і аднакласнікаў нечаканасцю:

— Калі заданні па рускай мове і матэматыцы на ЦТ амаль не адрозніваліся ад зместу рэпетыцыйных тэстаў, то на фізіцы стваральнікі тэстаў зрабілі сюрпрыз — з іх знік лі тэмы, якія былі на ўсіх трох раўндах рэпетыцыйнага тэсціравання, і ўвогуле тэсты аказаліся больш складаныя, чым рэпетыцыйныя, нічога агульнага з «рэпетыцыяй» экзамену яны не мелі. Усе выходзілі з тэсціравання разгубленыя, бо разлічвалі крыху на іншае.

Маючы ў суме 383 балы, можна замахнуцца на самыя прэстыжныя ў моладзі спецыяльнасці, але Яраслаў даўно для сябе вырашыў, што хоча навучацца на факультэце радыёфізікі ў БДУ, як і старэйшы брат. Хоць многія яго аднакласнікі з фізіка-матэматычнага профілю збіраюцца ісці ў праграмаванне.

— ІТ-сфера вельмі імкліва развіваецца, і я думаю, што знайсці ў ёй для сябе месца не складзе праблемы. Заўсёды будуць патрэбныя людзі, якія пішуць коды. А я хачу займацца «жалезам», ствараць фізічныя аб'екты, для якіх яны пішуцца, — разважае Яраслаў. — Мне падабаецца працаваць на толькі галавой, але і рукамі. З вялікай ахвотай наведваў у школе ўрокі працоўнага навучання. Дапамагаў бацьку з рамонтам.

Дарэчы, менавіта дзякуючы настаўніку працоўнага навучання Васілю Мікалаевічу Захараву гімназіст захапіўся разьбой па дрэве. Яго маці з гонарам дэманструе аўтарскія работы сына: шкатулку, хлебніцу, вешалку для ручнікоў і стол для піцця кавы.

— Разьба — вельмі карпатлівая праца, але гэтае хобі дапамагае развіваць і дробную маторыку, і прасторавае мысленне, — кажа яна. — Я бачу, што ў майго сына інжынерны тып мыслення, таму спадзяюся, што ён пра свой выбар факультэта і спецыяльнасці ніколі не пашкадуе. У любым выпадку цісніць на дзяцей у нашай сям'і не прынята, ды гэта і бэсэнсоўна...

Ёсць у Яраслава яшчэ адно хобі — баскетбол. Ён тры гады наведваў секцыю і выступаў за школьную каманду. А трэнерам быў усё той жа Васіль Мікалаевіч Захараў.

— Ён унікальны педагог, — кажа Яраслаў. — Васіль Мікалаевіч вучыў і майго старэйшага брата. Той таксама займаўся ў яго баскетболам. Ён заўсёды вітае ініцыятыву ў вучняў, не будзе моцна ўмешвацца, але ў той жа час абавязкова падтрымае і падкажа, калі гэта патрэбна.

Падчас вучобы ў БДУ хлопец спадзяецца таксама гуляць у баскетбол. Ці будзе ён далей займацца навукай і даследчай работай, пакуль адказаць не бярэцца.

— З інжынернай сферай трэба будзе пазнаёміцца бліжэй, — кажа ён. — Разглядаю розныя варыянты: работу ў канструктарскім бюро, робататэхніку... Але, напэўна, несур'ёзна сёння загадваць, што будзе праз чатыры гады, бо ўсё вакол нас так імкліва змяняецца. Трэба паспрабаваць сябе ў розных ролях. Але лічу, што толькі калі работа табе падабаецца, у гэтай сферы можна самарэалізавацца і чагосьці дабіцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з архіва героя.**

*Важацкі хлеб*

# «СУЗОР'Е» КЛЁВЫХ ПЕДАГОГАЎ

**Летась у рамках Усебеларускага злёту студэнцкіх атрадаў «Час руху!» Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі падвёў вынікі конкурсу «Працоўны семестр». Згодна з імі зводны педагагічны атрад Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка «Сузор'е» стаў пераможцам у намінацыі «Найлепшы педагагічны атрад Мінска». Таксама ў адпаведных намінацыях перамаглі яго камандзір, студэнт чацвёртага курса філалагічнага факультэта БДПУ Павел ЛАПАЦІНСКІ, і камісар, студэнтка чацвёртага курса таго ж факультэта Дар'я ГАЛАВАШ. Маладыя людзі не першы год у студатрадаўскім руху, таму могуць падрабязна расказаць пра свой вопыт і натхніць іншых на такі занятак.**



Павел Лапацінскі (у цэнтры) з атрадам.

— Яшчэ да паступлення я цікавіўся студэнцкімі атрадамі: два гады быў валанцёрам у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня», дапамагаў важатым з арганізацыяй вольнага часу школьнікаў, — падзяліўся дваццацігадовы Паша. — Зразумела, у будучыні хацелася і самому паехаць туды ў якасці важатага. Таму на другім курсе ўступіў у педатрад «Сузор'е» і адразу стаў яго камандзірам. Маёй асноўнай задачай на працягу двух гадоў было раскрыць найлепшыя здольнасці кожнага ў камандзе, падтрымаць, калі трэба, а таксама знайсці падыход да ўсіх дзяцей. Мы прыдумвалі для іх розныя гульні, цікавыя конкурсы, арганізоўвалі спартыўныя спаборніцтвы. Імкнуліся, каб летні адпачынак быў яркі і незабыўны.

У каманду «Сузор'я» трапляюць толькі працавітыя, мэтанакіраваныя і творчыя маладыя людзі. Тыя, хто мае выдатныя поспехі ў вучобе, а таксама з'яўляецца лідарамі грамадскіх арганізацый.

— Штогод з імі праводзяцца псіхалагічныя трэнінгі, майстар-класы ў рамках «Школы важацкага майстэрства». У першую чаргу студэнты хочуць тыя веды, якія яны атрымалі ва ўніверсітэце, апрабаваць на практыцы, — дадаў суразмоўнік.

Дваццаціаднагадовая Дар'я са школьных гадоў марыла пра работу важатай у дзіцячым цэнтры «Зубраня». Да паступлення сачыла за педагагічным атрадам «Сузор'е» ў сацсетках, бачыла, якія яркія эмоцыі засталіся ў тых, хто ўжо прайшоў праз свой першы працоўны семестр. На першым курсе дзяўчына прайшла сумоўе ў гэты атрад і паехала ў «Зубраня» амаль на месяц.



Ева Палонская падчас працоўнага семестра.

— З таго часу сваё лета праводзіла там. Складана было толькі першы раз. Перад кожным працоўным семестрам з намі праводзілася навучанне. Нягледзячы на тое што цяпер я ўжо дастаткова вопытная ў гэтай сферы, штораз наведвала іх з задавальненнем. У «Зубраняці» я была адказная за дзяцей шасці — адзінаццаці гадоў. Гэта мая любімая ўзроставая



Камісар Дар'я Галаваш.

катэгорыя: такія дзяўчынкі і хлопчыкі заўсёды вельмі ўдзячныя, паважліва ставяцца да нас, ахвотна ўзаемадзейнічаюць. Энергія ў іх б'е праз край, на месцы не сядзяць ні хвіліны! Мне больш за ўсё падабалася працаваць з імі над тымі праектамі, да якіх трэба было грунтоўна рыхтавацца, дзе задзейнічана шмат сіл. Вядома, праз пэўны час гэта выклікала невялікую стомленасць, аднак усмешкі і павага дзяцей — самае прыемнае для мяне ў такім вопыце, — кажа Дар'я.

Адпачывалі важатыя, збіраючыся на вячэрніх сходах пасля рабочага дня: абмяркоўвалі цікавыя падзеі, слухалі прапановы адно аднаго, падтрымлівалі, шукалі адказы на хвалюючыя пытанні. На думку Дашы, менавіта занятасць у «Зубраняці» дапамагла раскрыць ва ўсіх студэнтаў з атрада такія якасці, як камунікабельнасць і ініцыятыўнасць.

— Па-іншаму проста немагчыма! Бо дзеці заўсёды хочуць бачыць побач з сабой самага вясёлага, адказнага, адным словам — клёвага педагога. Дарэчы, я стараюся падтрымліваць сувязь з маімі «зубранятамі» і цяпер. Здараецца, сустракаю іх у школах ці на вуліцах Мінска, — кажа дзяўчына.

Сёлета камандзірам педагагічнага атрада «Сузор'е» стала **трэцякурсніца Інстытута інклюзіўнай адукацыі БДПУ дзевятнаццацігадовая Ева ПАЛОНСКАЯ.**

— Лічу сябе творчай асобай: вельмі люблю танцаваць, спяваць, добра іграю на гітары. А яшчэ імкнуся быць актыўнай усюды, таму калі на другім курсе даведалася пра магчымасць папрацаваць у педагагічным атрадзе ў «Зубраняці», адразу ж запісалася. Конкурс у каманду быў два чалавекі на месца, глядзелі на сярэдні бал паспяховасці ў вучобе, а таксама на нашы здольнасці і ўменні. Трэба было прыдумляць творчыя нумары, удзельнічаць у конкурсах, нават рашаць розныя лагічныя задачы. Такім чынам я апынулася ў дзіцячым цэнтры ў якасці важатай амаль на ўсё лета. Першая мая змена прайшла з дзецьмі шасці — адзінаццаці гадоў, другая — з маленькімі футбалістамі з Расіі шасці — васьмі гадоў, трэцяя — з падлеткамі шаснаццаці — сямнаццаці гадоў. Я адкрыты чалавек, таму адразу знайшла з выхаванцамі агульную мову. Кожны наш дзень быў напоўнены яркімі падзеямі, і мне радасна ад таго, што «зубранятам» спадабалася праводзіць са мной летні адпачынак. Дарэчы, да атрымання досведу ў гэтым месцы я працавала ў іншых дзіцячых лагерах і санаторыях і магу сказаць, што атмасферу ў «Зубраняці» нельга параўнаць ні з чым, — падкрэсліва суразмоўніца.

Пасля працоўнага семестра Ева і іншыя студэнты з атрада падтрымліваюць сувязь паміж сабою, сустракаюцца на розных мерапрыемствах.

— Такі вопыт, безумоўна, дае безліч карысных навыкаў, якія спатрэбяцца ў жыцці, а таксама шмат знаёмстваў. Нам як будучым педагогам гэта вельмі важна для далейшага станаўлення ў прафесіі. Спадзяюся, сітуацыя з каранавірусам не перашкодзіць нам улетку так жа крута адпачыць і папрацаваць, як і ў папярэднія гады. Дарэчы, некаторыя мае знаёмыя і аднагрупнікі таксама зацікавіліся студатрадаўскім рухам і ўжо гэтым летам плануюць паехаць у «Зубраня» разам з намі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота дадзены героямі.**

*І так бывае...*

# «Гарадскім хочацца цішыні, а нам — адпачыць ад яе»

**З ранку свіней пачысціць, потым — карову падаіць, а ўвечары — на дыскатэку. Прадстаўнікі моладзі з дзвюх суседніх вёсак Столінскага раёна — Асаўца і Асавой — расказваюць пра свой лад жыцця.**

## Мікалай АЛЯШКЕВІЧ, 16 гадоў:



— Вольнага часу ў сельскай мясцовасці не так шмат, так што кожны адпачынак хочацца правесці карысна, весела, з душою. Усе забавы, якія тут ёсць, працэнтаў на 80 — ініцыятыва самой моладзі. Але падтрымлівае і школа, збольшага ў спартыўным кірунку. Што накont творчасці, то ў Доме культуры ёсць творчае аб'яднанне, але... Тут можна казаць пра разрыў пакаленняў. Гэта музычны гурток, удзельніцамі якога з'яўляюцца бабулькі 65+ у народных касцюмах з гармонікам. Але што там моладзі рабіць? Не разумею. Нашаму пакаленню такое ўжо нецікава. Актыўных хлопцаў і дзяўчат хапае, але ў поўнай меры яны не могуць раскрыць свой патэнцыял.

Для сябе я ўжо вырашыў, што ў горад перабяруся абавязкова. Паступлю ў ВНУ, адвучуся ды і застануся. У горадзе зарплаты вышэйшыя, ёсць магчымасць рэалізаваць сябе як асобу. Чым вёска адрозніваецца ад горада? У горадзе не сорамна быць іншым, быць яркім, быць самім сабой. У вёсцы ўсе прывыклі злівацца, быць аднолькавымі, не высоўвацца, быць стрыманымі: у знешнім выглядзе, думках, пачуццях. Але гэта не пра мяне.

## Лілія КВЯТКО, 15 гадоў:



— Як на вёсцы моладзі жывецца? Працуем, бацькам дапамагаем гаспадарку весці. Але, як і ўсякая моладзь, пра забавы не забываемся: блізкія сябры побач, вогнішча, бульба з салам ды песні — прыгажосць! Калі сілы і энергія застаюцца, можам у валейбол ці футбол пагуляць. Што да дыскатэк — менавіта для нашай вёскі гэта неактуальная тэма. Хоць кожныя выхадныя ў Доме культуры яе ладзяць, але туды ніхто не ходзіць... У суседніх вёсках усё інакш: збіраюцца, танцуюць. Там і людзей больш. У нас усе сарамлівыя ці грошай шкадуюць, бо наведванне танцпола платнае. Наш вясковы DJ дзядзька Мікола так і сядзіць з музыкай хвілін сорак, потым, разумеючы, што чакаць наведвальнікаў сэнсу няма, вырубае музыку, дастае ключ з кішэні і зачыняе дзверы. Вы не падумайце, наведвальнікі ў Доме культуры ёсць, але яны ходзяць не на дыскатэку, а на тэніс: на другім паверсе будынка ёсць і стол, і ракеткі.

Калі ўжо гаварыць на больш сур'ёзную тэму, напрыклад, пра самаразвіццё, дык у вёсцы гэта рэальна. Мясцовыя юнакі і дзяўчаты могуць праявіць сябе са спартыўнага, творчага і інтэлектуальнага боку. У першым выпадку дапаможа школа. Што накont творчасці, то тут усё схіляецца ў бок рукадзелля. А факультатывы пры школе дапамагаюць узбагаціцца інтэлектуальна. Што хачу сказаць: патэнцыял моладзі тут можна раскрыць, але на базавым узроўні. Калі нехта пажадае скокнуць вышэй, заняцца нечым нетыповым, то ў вёсцы не дапамогуць. Ну, напрыклад, захацелася мне танцаваць vogue на прафесійным узроўні, дзядзька Мікола не навучыць жа! Ці захачу на скрыпцы навучыцца граць. Па-першае, у вёсцы такога інструмента ні ў кога няма — пазычыць немагчыма, а па-другое, няма чалавека, які б навучыў.

З кожным годам у нашай вёсцы ўсё менш моладзі: паступаюць у ВНУ, а потым і застаюцца ў гарадах. Вясковым не хапае дзвіжу, ужо ў 22.00 мала каго можна сустрэць на вуліцы. Для нас тут занадта спакойна. Калі гарадскія прыязджаюць сюды, каб адпачыць ад шуму, людзей, то нашым хочацца адпачыць ад той самай цішыні і ўбачыць новыя твары.

**Кацярына ЯРАШЭВІЧ, студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко», Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, д. 150** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Алрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование (назначение) | Инв. № | Общ. пл. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Здание заправочной склада ГСМ** (здание неустановленного назначения). **Составные части и принадлежности**: железобетонный островок под топливозаправочными колонками, резервуар (3 шт.), емкость (15 шт.), емкость для эмульсий (2 шт.). **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/21 | 350/С-204136 | 35,5 кв. м |
| | **Открытый склад металла** (сооружение специализированное складов, хранилищ). **Составные части и принадлежности:** площадка (мощение), подкрановые пути козлового крана (2 шт.), ограждение, ворота (2 шт.), склад. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/22 | 350/С-204137 | 3 203,7 кв. м |
| | **Склад лакокрасок, ГСМ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). **Составные части и принадлежности**: пристройка. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150В | 350/С-210707 | 186 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,8037 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания открытого склада металла с участком лакокрасок и ГСМ | | |
| | **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. **Составные части и принадлежности**: бордюр. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-209431 | 40 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0262 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| | **Ангар участка нестандартного оборудования** (здание неустановленного назначения). **Составные части и принадлежности**: ангар, площадка, три ограждения, ворота. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/20 | 350/С-206388 | 369,1 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,4458 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания ангара участка нестандартного оборудования | | |
| | **Начальная цена (с НДС 20 %) – 369 415,00 бел. руб.** | | |
| 2 | **Производственное помещение** (производственное помещение). **Составные части и принадлежности:** пристройка (11 шт.), склад ОКСа, прессовый участок, навес, подкрановые пути, две автомобильные дороги, два ограждения. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/2-1 | 350/D-298466 | 9 108,2 кв. м |
| | **Магазин** (здание специализированное розничной торговли). **Составные части и принадлежности:** две пристройки, крыльцо **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-74042 | 162 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 1,6127 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания ремонтно-механического цеха и здания специализированного розничной торговли | | |
| | **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) **Составные части и принадлежности:** автодорога, бордюр, ворота, ограждение. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-209429 | 575 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0575 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| | **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) **Составные части и принадлежности**: бордюр **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-209430 | 187 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,1258 га, предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов иного назначения | | |
| | **Начальная цена (с НДС 20 %) – 2 213 514,65 бел. руб.** | | |
| 3 | **Здание специализированное обрабатывающей промышленности (участок механической обработки)** (здание специализированное обрабатывающей промышленности). **Составные части и принадлежности:** пристройка, навес, здание подкачки и монтажа шин, помещение склада участка безрельсового транспорта, гараж, склад металла, ворота, калитка, три ограждения, канава для осмотра автомашин. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/ 17 | 350/С-167815 | 837,1 кв. м |
| | **Цех безрельсового транспорта** (здание специализированное транспорта). **Составные части и принадлежности:** две пристройки, площадка, два ограждения, четыре отстойника. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/16 | 350/С-75350 | 569,8 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,6481 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания специализированного транспорта, здания специализированного складов | | |
| | **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) **Составные части и принадлежности**: бордюр **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-209428 | 93 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0864 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| | **Начальная цена (с НДС 20 %) – 562 152,75 бел. руб.** | | |

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 17.06.2020.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**

Начало торгов: **11.00 10.08.2020**. Окончание торгов: **12.00. 10.08.2020**.

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 06.08.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»

***(Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49)***

сообщает, что внеочередным общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 20 июля 2020 года, принято решение о выплате дивидендов за первое полугодие 2020 года – 1 рубль 15 копеек на одну простую (обыкновенную) акцию.

Выплата дивидендов по акциям будет производиться с 21.07.2020 по 31.12.2020.

Порядок выплаты дивидендов акционерам: юридическим лицам – путем зачисления на их расчетные счета, физическим лицам дивиденды выплачиваются через кассу ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» или высылаются почтовым переводом (в пределах Республики Беларусь).

УНП 400078769

***ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1***

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

## Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», 8 (0232) 29 51 12

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (торговый павильон) с инв. № 350/С-215588, площадью 76,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Свердлова, 3Б/1. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000008000218 площадью 0,2176 га (доля в праве пользования) | **185 000,00** | **18 500,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 26 августа 2020 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **28 августа 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете *«Звязда» от 23.07.2020 г.* |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продовольственными товарами и общественного питания. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 3 (три) месяца. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Для участия в аукционе необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация»

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: **ОАО «Гомельгазстрой»** (УНП 400230107), г. Гомель, пр-т Геофизиков, 1, в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Ликвидация и банкротство», тел. +375 (33) 366-87-87.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **07 августа 2020 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

| № п/п | Наименование, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Ограничитель нагрузки крана ОНК-160Б-38 (инв. № 050581) | 220,00 |
| 2 | Компрессор ЗИФ-ПФ-М (инв. № 080448) | 650,00 |
| 3 | Компрессорная станция ПКСД-1,5-16 (инв. № 0805451) | 1 150,00 |
| 4 | Стыковой сварочный аппарат STH-250 Trace Weld Plus (инв. № 050583) | 2 800,00 |
| 5 | Установка контактной сварки (инв. № 040838) | 1 150,00 |
| 6 | Грузовой плетевоз URAL 4320 ПВ (рег. знак ЕМ 2682), 1991 г. в., рама № 170449, цвет зеленый | 5 150,00 |
| | Местонахождение: г. Гомель, пр-т Геофизиков, 1 | |
| 7 | Капитальное строение с инв. № 350/С-79989 (склад краски) общей площадью 513 кв. м, г. Гомель, ул. Базовая, 6 | 36 360,00 |
| 8 | Капитальное строение с инв. № 350/С-161940 (здание гаража) общей площадью 1296,6 кв. м, г. Гомель, ул. Базовая, 6, покрытие щебеночное (инв. № 020737) | 127 350,00 |
| 9 | Капитальное строение с инв. № 350/С-161942 (здание материального склада) общей площадью 746 кв. м, г. Гомель, ул. Базовая, 6, забор ограждения блочный (инв. № 020740) | 64 440,00 |
